незалежная газета

№ 13 (659) 1 красавіка 2010

www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе 1906. Аднаўленая ў маі 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады

## Вялікдзень



## «Які аказаўся пляменнікам Ломаця»

Старонка 3



# «Урэшце, трэба сысці ад залежнасці»

**Лукашэнка абяцае за пяць гадоў забяспечыць энергетычную незалежнасць краіны.**

26 сакавіка падчас цырымоніі ўручэння дзяржаўных узнагарод кіраўнік Беларусі сканцэнтраваў увагу на пытанні энергетычнай бяспекі краіны.

«Беларусь будзе вырашаць свае праблемы, у тым ліку ў энергетыцы, з тымі дзяржавамі, якія да яе нармальна ставяцца», — зазначыў А.Лукашэнка, яўна робячы папрок Расіі.

«Шчасце сваё мы шукаем там, дзе да нас нармальна ставяцца, прымаюць, паважаюць, дзе плацяць за нашу працу. І плацяць годна. Я думаю, вы разумееце, пра што ідзе гаворка», — працягнуў кіраўнік краіны.

Ён лічыць пустым ёрніцтва з нагоды таго, з кім і як беларуская дзяржава імкнецца забяспечыць незалежнасць, у тым ліку энергетычную бяспеку. Адразу згадваюцца расійскія сатырычныя перадачы, кшталту «Пражэктарперысхілтар», дзе вядучыя сцябаліся, што нафту з Венесуэлы Лукашэнка будзе вазіць пры дапамозе цыганскага табара.

У менш саркастычнай форме, але ў падобнай рыторыцы адрэагавалі на пагадненне паміж Беларуссю і Венесуэлай цэнтральныя расійскія выданні. «Коммерсант» адзначыў, што ў расійскіх кіроўных элітах са скептыцызмам глядзяць на пагадненне паміж Беларуссю і Венесуэлай аб штодзённых пастаўках у сінявокую 80 тысяч барэляў нафты з Паўднёвай Амерыкі.

Ананімны суразмоўца з Адміністрацыі Мядзведзева-Пуціна зазначыў, што гэта нельга параўнаць з тымі ўліваннямі, што робіць у беларускую эканоміку Расія. Тым не менш, рэакцыя Крамля ўсё адно досыць нервовая.

**Працяг на старонцы 3.**

## У НУМАРЫ

**Сідорскі: «Мае заводы нарошчваюць аб'ёмы»**

У гутарках з расійскімі СМІ прэм'ер смялейшы, чым на нарадах у Адміністрацыі. **Старонка 2.**

**«Нам у міліцыі такія не патрэбныя, якія ідуць супраць сваіх»**

Дзяніс Бяляк хацеў быць міліцыянтам, пакуль сам не папаў у міліцыю. **Старонка 5.**

**Каму з суседзяў жыць добра?**

«НН» параўноўвае цану кошыка прадуктаў у Мінску і суседніх сталіцах. **Старонка 4.**

**Каўбасы як какаін**

Навукоўцы даказалі, што абжорства — форма наркаманіі. **Старонка 13.**

«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі **старонку 2**.

## Мора між Стоўбцамі і Новым Свержанем

У Беларусі — найбольшая за 30 гадоў паводка. **Старонка 9.**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ



**Крэдыт для голага караля**

«Пане Каханку» — новы адовішчны спектакль у тэатры імя Горкага. **Старонка 11.**

## «Людзі страшна крычалі»

У выніку выбухаў, што прагрымелі 29 сакавіка ў маскоўскім метро, загінулі 38 чалавек і каля 60 параненыя. Дзве тэрарысткі-смяротніцы ўзарвалі бомбы, нашпігаваныя шрубамі і гайкамі. Следчыя ўжо знайшлі іх галовы.

Першы выбух адбыўся ў 7.52 раніцы ў цягніку, што спыніўся на цэнтральнай станцыі «Лубянка» — пад будынкам ФСБ. Смяротніца ўзарвала сябе, увайшоўшы ў вагон. Усе людзі побач былі імгненна забітыя, начынка бомбы разляцелася, ранячы тых, хто стаяў далей.

**Працяг на старонцы 6.**





# Сідорскі: Мае заводы нарошчваюць аб’ёмы

Прэм’ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі даў інтэрв’ю для расійскага сайта дзелавых навін slon.ru. У гутарцы з карэспандэнтам другі па ранжыры чалавек у беларускай уладзе быў больш смелы, чым на нарадах у Лукашэнкі.

Журналіст пацікавіўся, чаму большасць беларускіх прадпрыемстваў застаюцца дзяржаўнымі. «Калі вы возьмеце зрэз беларускай эканомікі, то сёння 64% — гэта прадпрыемствы, якія не маюць дзяржаўнага капіталу. Сёння МАЗ — акцыянернае прадпрыемства, усе нашы нафтавыя заводы — акцыянерныя кампаніі. Але яны кіруюцца праз дзяржаўны пакет акцый. Мае заводы нарошчваюць аб’ёмы. Там, дзе я хачу падняць, я інвестую ад дзяржавы ў пакет акцый, даю доўгатэрміновыя інвестыцыі праз сістэму банкаў і атрымліваю аддачу гатовай прадукцыяй, экспартнай прадукцыяй. І грошы зноў вяртаюцца беларускаму ўраду», — зазначыў прэм’ер.

Што датычыць Мытнага саюза, то Сідорскі бачыць у ім не толькі плюсы. «Адзіныя правілы, што дзейнічаюць у Мытным саюзе, ствараюць для Беларусі не толькі яўныя выгады, але і пэўныя фактары слабасці, але мы разлічваем, што праца ў складзе Мытнага саюза дасць нам больш плюсаў».

**Зміцер Панкавец**

### ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ

### Дабрачынны канцэрт памяці Джэксана

31 сакавіка ў сталічным клубе «Рэактар» (Харужай, 29) пройдзе дабрачынны трыб’ют-канцэрт памяці Майкла Джэксана HISstory. Беларускія выканаўцы выступяць з арыгінальнымі трэкамі і кавер-версіямі песень Майкла Джэксана. Сваю прысутнасць пацвердзілі гурты Neuro Dubel, Litesound, Георгій Калдун, Вольга Плотнікава і іншыя. Заробленыя падчас канцэрта грошы накіруюць у дзіцячыя дамы.

# Лячыць раны і сунімаць боль

Велікоднае пасланне айца **Аляксандра Надсана**.



PHOTO.BYMEDIA.NET

Нядаўна мне давялося ісці адной вуліцай Лонданскага прадмесця. Вуліца была амаль пустая, толькі крыху далей я бачыў чалавека, які стаяў, абапёршыся аб сцяну дома. З выгляду ён быў адным з тых, каго ангельцы называюць далікатна gentleman of the road, а беларусы — «бомж». Калі я зраўняўся з ім, ён, глянуўшы, плюнуў са злосцю ў мой бок. Ад нечаканасці я разгубіўся і доўга не мог супакоіцца. Мяне мучыла думка: што змусіла гэтага чалавека выказаць такім чынам сваё стаўленне да святароў (мая вопратка не пакідала сумневу, хто я).

Спачатку мне прыйшлі на думку словы Хрыста сваім вучням: «Калі свет вас ненавідзіць, ведайце, што Мяне ён раней узненавідзеў... Памятайце слова, якое Я вам сказаў: слуга не большы за свайго гаспадара. Калі Мяне пераследавалі, будуць пераследаваць і вас» (Ян 15: 18, 20). Аднак я хутка адкінуў гэтую спакуслівую думку, бо ўзгадаў святароў, пра якіх так шмат пісалася і гаварылася апошнім часам у сродках масавай інфармацыі, і якія, забыўшыся на сваё высокае пакліканне, злоўжываючы даверам, які яны мелі ў людзей, займаліся разбэшчваннем дзяцей, робячы іх духоўнымі калекамі на ўсё жыццё. Магчыма той бомж, які плюнуў на мяне, пацярпеў у дзяцінстве ад нягодных святароў. Дык ці маю я права крыўдаваць на яго?

Госпад Ісус Хрыстос сказаў: «Прыйдзіце да Мяне ўсе спрацаваныя і абцяжараныя, і Я супакою вас. Вазьміце ярмо маё на сябе і навучыцеся ад Мяне, бо Я лагодны і пакорны сэрцам; і знойдзеце супакой вашым душам» (Мц 11:28-29).

У іншым месцы Ён кажа: «Я прыйшоў, каб жыццё мелі, і мелі ўдосталь. Я — добры Пастыр; добры пастыр жыццё сваё аддае за авечак» (Ян 10: 10-11). Гэта не былі пустыя словы, як сведчаць гэтыя святыя дні, калі мы ўзгадваем Ягоную смерць на крыжы і слаўнае ўстанне з мёртвых на трэці дзень, якім Ён даў нам усім магчымасць быць дзецьмі Божымі. Дзякуючы Яму за ўсё, што Ён учыніў для нас, будзем маліцца за нашых святароў, каб яны, беручы прыклад з іхняга Боскага настаўніка, былі добрымі пастырамі, поўнымі Боскага духу, лечачы духоўныя раны і сунімаючы боль.

І хай Госпад і Бог наш Ісус Хрыстос, які ўваскрос з мёртвых, прынясе суцяшэнне і супакой збалелым і пакрыўджаным душам і напоўніць радасцю і любоўю сэрцы ўсіх нас.

Хрыстос уваскрос!

**А. Аляксандр Надсан, апостальскі візітатар для беларусаў-каталікоў замежжа, Вялікдзень 2010 г.**

## СЦІСЛА

### Пасяджэнне Еўранеста адкладзена з прычыны Беларусі

на няпэўны тэрмін. Гэта звязана з рознагалоссямі паміж еўрапарламентарамі і парламентарамі краін-партнёрак адносна складу беларускай дэлегацыі. Еўрапарламент падрыхтуе для Беларусі спецыяльную «дарожную карту рэформаў». Ступень яе выканання будзе крытэрам, паводле якога будзе вызначацца ўзровень далучэння прадстаўнікоў беларускага парламента да «Еўранеста». Еўрапарламент выступіў за тое, каб адвесці ў «Еўранесце» дзесяць месцаў выключна для беларускай апазіцыі.

### Пачынаецца рэканструкцыя Мінскай кальцавой

Пра гэта паведамілі ў «Белаўтадары»: «Сёлета трэба адрамантаваць не менш за 6 км, інакш наступнай зімы яна проста не перажыве».

### Польшча прагне імігрантаў з Усходу

Сёлета прадпрыемствы краіны падалі заяўкі на 200 тысяч імігрантаў. Гэта рэкорд. Летась прадпрымальнікі заяўлялі пра гатоўнасць прыняць 180 тысяч суседзяў з-за ўсходняй мяжы.

### Рок-фестываль Be Free пройдзе ў Чарнігаве

Пачалася падрыхтоўка да IV міжнароднага рок-фестывалю Be Free. Фэст пройдзе ў Чарнігаве (Украіна). На працягу двух дзён на сцэну будуць выходзіць беларускія і замежныя музыкі. Хто сёлета возьме ўдзел, арганізатары яшчэ не вызначылі.

**СМ**


# Не ўсё ў жыцці апошні раз

## Падпісацца можна праз Рэдакцыю і праз «Белпошту». Мы рэкамендуем — праз Рэдакцыю

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае 7500 рублёў.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Усе тыя, каго такі спосаб атрымання газеты задавальняе, хай застаюцца вернымі такой падпісцы.

Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — 63125, для прадпрыемстваў — 631252. Падпісацца можна на кожнай пошце. Цана гэтай падпіскі — 8 520 руб. на месяц.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

ПВУП “Суродзічы”, УНП 190 786 828
МГД ААТ “Белінвестбанк”, вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764
Рахунак атрымальніка 3012 206 280 014 Асабовы рахунак
(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)
Від аплаты | Дата | Сума
За газету "Наша Ніва"
Агулам
Касір

ПВУП “Суродзічы”, УНП 190 786 828
МГД ААТ “Белінвестбанк”, вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764
Рахунак атрымальніка 3012 206 280 014 Асабовы рахунак
(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)
Від аплаты | Дата | Сума
За газету "Наша Ніва"

КВІТАНЦЫЯ

Агулам
Касір М.П.

**Каб штотыдзень атрымліваць газету,** дасылайце адрасы і грошы за газету. Кошт на месяц — 6 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газету **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) **Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага перапказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад’езду.**


# Дзякуй

## падпісчыкам, якія падпісваюцца праз рэдакцыю

А.А., Ліяне Ш. з Мінскага раёна.
Руслану К. з Полацкага раёна.
Івану Д. з Мядзельскага раёна.
Галіне Г. з Барысаўскага раёна.
С.К. з Лідскага раёна.
Антону Б., Галіне Ю. з Верхнядзвінскага раёна.
Г.Я. са Светлагорскага раёна.
Іосіфу Д. з Гродзенскага раёна.
Міхаілу Т. са Слуцкага раёна.
Аляксандру А. з Пінскага раёна.
Уладзіміру Д., Анатолю І. з Чэрвеньскага раёна.
У.Л. з Маладзечанскага раёна.
Барысу Л. з Пастаўскага раёна.
А.П. са Жлобінскага раёна.
А.К. з Баранавіцкага раёна.

# Пяць плюсаў і пяць мінусаў Міхалевіча

«Наша Ніва» працягвае разглядаць слабыя і моцныя бакі патэнцыйных кандыдатаў у прэзідэнты ад апазіцыі. Алесь Міхалевіч быў першым, хто заявіў пра свой удзел у кампаніі-2011.



**Алесь Міхалевіч**
нар. у 1975. Ён з сям'і навукоўцаў. Скончыў БДУ па спецыяльнасці паліталогія. Узначальваў Задзіночанне беларускіх студэнтаў, доўгі час уваходзіў у Партыю БНФ. Быў дэпутатам Пухавіцкага райсавета. Жанаты, мае двух дачок.

ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

### 1. Маладосць

+ «Прэзідэнцкага» цэнзу (35 гадоў) Алесь Міхалевіч дасягне толькі ў маі. Ужо цяпер можна смела гаварыць, што гэта будзе самы малады кандыдат на выбарах. Узрост дае Міхалевічу большую мабільнасць. Ён прагматычны, ягоная рыторыка не зводзіцца толькі да лёсу мовы ці адкрытай канфрантацыі з уладай Лукашэнкі. Ён яшчэ не стомлены ад палітыкі, як некаторыя ягоныя сябры-канкурэнты па дэмакратычным лагеры.

— Але ўзрост можа быць не толькі станоўчым фактарам, але і адмоўным. «Малады, куды яму яшчэ ў прэзідэнты», — падумае нейкі выбаршчык. «Досведу мала, няхай спачатку папрацуе на менш адказнай пасадзе», — дадасць другі. Зрэшты, маладыя гады (39 гадоў) у 1994 не перашкодзілі Лукашэнку стаць першым прэзідэнтам Беларусі.

### 2. Праца з людзьмі

+ Міхалевічу няма роўных у беларускай палітыцы ў працы з чалавекам у фармаце «тэт-а-тэт». Замест тэлефонных ці інтэрнэт-размоваў Алесь заўсёды аддасць перавагу асабістай сустрэчы. Веданне людской псіхалогіі прыводзіць да таго, што суразмоўцы Міхалевіча амаль заўсёды згаджаюцца з ягонымі аргументамі. Міхалевіч, падобна павуку, незаўважна расплёў сваю павуціну ў рэгіёнах. За ім стаяць актывісты ў невялікіх гарадах, кшталту Смалявічаў, Горак, Гарадка, Светлагорска. У сталіцы ж вялікай падтрымкі палітык пакуль не мае, а Мінск дае большасць сабраных за кандыдата подпісаў. Напрыклад, у 2006 годзе Казулін сабраў у Мінску 50 са 150, а Мілінкевіч — 60 з 200 тысяч подпісаў у сваю падтрымку.

— Пра Міхалевіча як публічнага палітыка вядома мала. Ён моцны ў ценявой працы, у даверлівых кантактах з аднадумцамі ці з заходнімі донарскімі арганізацыямі. Калі ж Міхалевіч ідзе на выбары, то хоцькі-няхоцькі давядзецца выходзіць з цяню.

### 3. Адукацыя

+ У Алеся Міхалевіча добрая адукацыя. Ён быў адным з першых выпускнікоў Ліцэя імя Якуба Коласа. Скончыў БДУ па спецыяльнасці «паліталогія». Потым стажыраваўся ў Варшаўскім і Оксфардскім універсітэтах. Вучыўся ў аспірантуры Інстытута дзяржавы і права Акадэміі навук. Міхалевіч размаўляе па-англійску, што для беларускай палітыкі не такая частая з'ява.

— Зрэшты, толку ад той адукацыі, калі практычна ўсё свядомае жыццё Міхалевіч з'яўляецца беспрацоўным. Гэта адразу адштурхоўвае ад такога кандыдата частку электарату. На фоне Міхалевіча Саннікаў і Мілінкевіч выглядаюць у больш выгаднай сітуацыі, бо ў свой час папрацавалі на салідных пасадах.

### 4. Сацыяльныя сеткі

+ Тут Міхалевіча можна лічыць першапраходцам сярод беларускіх палітыкаў. Ён першым завёў сабе інтэрнэт-дзённік. Можа, акурат таму беларуская благасфера ставіцца да палітыка досыць прыязна. Ён там «свой» чалавек, якому можна пазычыць поспехаў ці паспрачацца. Таксама Алесь актыўнічаў на такіх папулярных рэсурсах, як vkontakte.ru, «Аднакласнікі» і facebook.

— За Міхалевічам цягнецца шлейф канфліктаў і скандалаў. Яшчэ ў 2006 годзе, напярэдадні тых прэзідэнцкіх выбараў, палітыка злавілі на мяжы з Расіяй з накладам фальшывай «Советской Белоруссии». Тады справу на Міхалевіча так і не завялі. А ў 2008 годзе тагачаснага намесніка старшыні Партыі БНФ Алеся Міхалевіча выключылі з арганізацыі за непадпарадкаванне партыйнай дысцыпліне.

### 5. Голас

+ Натуральная беларускасць. Для Міхалевіча беларуская мова не ёсць «працоўнай», на ёй ён гаворыць і дома, і паўсюль. Упершыню пасля Пазняка і Шушкевіча мы будзем мець настолькі беларусацэнтрычнага кандыдата.

— У Міхалевіча не камандны голас. Не такі, каб кожнае ягонае слова з заміраннем сэрца лавілася на шматтысячным мітынгу. Голас не пастаўлены, слабы, надрыўны. Зрэшты, і касцюмы на Міхалевічу сядзелі не лепшым чынам, але з часам палітык навучыўся апранацца, калі не бездакорна, то блізка да гэтага.

**Зміцер Панкавец**

# «Урэшце трэба сысці ад залежнасці»

Працяг са старонкі 1.

Часопіс «Власть» падкрэсліваў, што сваім візітам у Каракас, калі ў Брэст прыляцеў Уладзімір Пуцін, Лукашэнка паказаў, што збіраецца не проста сябраваць з Венесуэлай, але сябраваць супраць Расіі. «Дакладна так паводзіў сябе Лукашэнка і калі аднаўляў адносіны з Еўрасаюзам, і калі яшчэ больш дэманстратыўна сябраваў са зненавідным Маскве Віктарам Ючшанкам, накіроўваючыся цягам свайго візіту ў Кіеў глядзець Музей галадамору», — зазначае выданне.

«Усё, што мы сёння робім, найперш — я — гэта накіравана на забеспячэнне нашай дзяржавы і захаванне яе незалежнасці. Гэта найважнейшая задача, якая сёння вырашаецца. Нам, урэшце, трэба сысці ад залежнасці, каб нас пастаянна не штурхалі, нагадваючы пра тое, што мы жывём за кошт кагосьці», — падкрэсліў А.Лукашэнка.

Калі Беларусі насамрэч удасца пачаць пастаўляць нафту з Венесуэлы, то гэта будзе найбольшым за часамі незалежнасці крокам да змяншэння энергетычнай, а значыць і палітычнай, залежнасці ад Расіі. Да гэтага і нафта, і газ у нашу краіну паступалі толькі з усходняй суседкі.

Цікава, што ўжо ў панядзелак Лукашэнка заявіў падчас сустрэчы з кіраўніцтвам буйных кампаній ЗША, што Беларусь гатова пакінуць усе крыўды ў мінулым і пачаць плённае супрацоўніцтва са Штатамі не толькі ў эканамічнай, але і ў іншых сферах.

«Беларусь зацікаўленая ў развіцці паўнавартасных узаемавыгадных канструктыўных адносінаў з наймагутнейшай дзяржавай свету», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

У Маскве апошнія выпады Лукашэнкі таксама не засталіся незаўважанымі. Адразу пасля сустрэчы з амерыканцамі адбылася тэлефонная размова паміж Лукашэнкам і Мядзведзевым, у час якой яны дамовіліся аб сустрэчы ў бліжэйшы час.

**ЗП**

## «Які аказаўся пляменнікам Ломаця»

Ад 10 жніўня ў Вярхоўным судзе адбываецца разгляд крымінальнай справы супраць былога пракурора Мінскай вобласці Міхаіла Снегіра. Суд праходзіць пры зачыненых дзвярах, таму падрабязнасці працэсу давядацца амаль немагчыма.

Тым не менш, нядаўна ў СМІ з'явіўся тэкст адкрытага ліста экс-пракурора да Аляксандра Лукашэнкі.

Ліст напісаны ў вернападданіцкай стылістыцы. «Бязмежна верачы Вам як гаранту Канстытуцыі краіны, як чалавеку, які шчыра любіць свой народ і дбае за яго спакой і дабрабыт, як найчэснаму і найсправядлівейшаму кіраўніку, звяртаюся да Вас з просьбай азнаёміцца з наступнай інфармацыяй».

Высвятляецца, што Снегір быў адным з тых аўтараў, што ў 1993 годзе падрыхтавалі для Лукашэнкі ягоны вядомы антыкарупцыйны даклад. Былы пракурор кажа, што барацьба супраць карупцыі заўсёды была для яго асноўнай задачай дзейнасці.

«Асаблівага ворага я нажыў сабе пасля прыцягнення да крымінальнай адказнасці дырэктара Слуцкага ААТ «Ярок» Ярашэвіча, які аказаўся пляменнікам Зянона Ломаця... Ломаць шмат разоў патрабаваў ад мяне «замяць» справу, з чым я катэгарычна не згаджаўся. Пасля прызначэння Ломаця старшынёй Камітэта дзяржкантролю я адчуў у дачыненні сябе з яго боку «асаблівую» ўвагу», — піша М.Снягір.

Чарговы канфлікт паміж Снегіром і Ломацем узнік праз дырэктара агракамбіната «Дзяржынскі» Сямёна Шапіра (сённяшні міністр сельскай гаспадаркі — «НН»), якога старшыня КДК патрабаваў «пасадзіць любой цаной».

«Пра намеры Ломаця «звесці са мной рахункі» я неаднаразова дакладваў генпракурору Пятру Міклашэвічу і дзяржсакратару Рады бяспекі Віктару Шэйману. З мэтай маёй дыскрэдытацыі Ломаць і ягоны дарадца Пісарык выкарысталі сітуацыю, якая была звязаная з набыццём мной кватэры», — працягвае Снягір.

Справа пракурора Міхаіла Снегіра пачалася ў лістападзе 2008 года, калі Лукашэнка падчас нарады з сілавікамі і суддзямі абвясціў пра «харомы, купленыя Снегіром на вуліцы Грыбаедава па заніжанай цане». Таксама гаворка зайшла пра катэдж, што будаваў пракурор блізу Цнянскага вадасховішча.

У хуткім часе Міхаіл Снягір апынуўся ў турме. Але калі будзе вынесены вырак па справе, яшчэ невядома.

**ЗП**

## Ягор Рыбакоў на волі

**Яшчэ ў лютым са шклоўскай калоніі быў датэрмінова вызвалены былы кіраўнік Белтэлерадыёкампаніі Ягор Рыбакоў.**

У 2005 годзе рашэннем Вярхоўнага суда Ягор Рыбакоў быў асуджаны да 11 гадоў пазбаўлення волі з адбываннем у калоніі ўзмоцненага рэжыму, канфіскацыяй маёмасці і пазбаўленнем права займаць адказныя пасады на працягу 5 гадоў.

Рыбакова абвінавацілі ў атрыманні хабару, а таксама ў выкарыстанні службовых паўнамоцтваў у мэтах легалізацыі сродкаў, атрыманых незаконным шляхам.

Рыбакоў браў «адкаты» са здзелак, што рабіла Белтэлерадыёкампанія. Ён абяцаў пэўнай фірме выйгрыш тэндэра, але за гэта прасіў пэўны працэнт на ўзнагароду. У матэрыялах крымінальнай справы таксама фігураваў домік на Цнянцы, які Рыбакоў збіраўся купіць за 500 тысяч даляраў, але праз арышт справу так і не давёў да канца.

Кіраўніком БТ Рыбакоў стаў у 30 гадоў, ён быў адным з наймаладзейшых менеджэраў у атачэнні Лукашэнкі. Але ўжо праз два гады пасля прызначэння яго чакаў арышт.

У турме Рыбакоў працаваў па профілі — узначальваў мясцовую тэлестудыю.

**ЗП**

## СЦІСЛА

### БХД: Адзіным кандыдатам павінен быць той, хто збярэ найбольшую ініцыятыўную групу

«Асноўныя высілкі мы накіруем на вылучэнне свайго кандыдата ў прэзідэнты. Мы ўжо цяпер можам казаць, што БХД здольная сабраць 100 000 подпісаў на прэзідэнцкай кампаніі, і мы будзем рабіць усё, каб адзіным кандыдатам ад БНБ стаў кандыдат ад БХД Віталь Рымашэўскі», — зазначыў сустаршыня хадэкаў Павел Севярынец.

### Палітрэкрут зарэгістраваны кандыдатам у дэпутаты

Палітрэкрут Франак Вячорка зарэгістраваны кандыдатам у дэпутаты на мясцовых выбарах па 25-й Мазырскай станцыйнай выбарчай акрузе. Агулам кандыдатамі ў дэпутаты зарэгістраваныя 240 прадстаўнікоў апазіцыйных партый. Гэта трохі больш, чым тры гады таму.

**ЗП**

# Каму з суседзяў жыць добра?

«НН» параўноўвае цану кошыка прадуктаў у Мінску і суседніх сталіцах.

Рост ВУП, змены падатку на дабаўленую вартасць і мільярдныя крэдыты ад МВФ — лічбы, далёкія ад насельніцтва. Калі да азвярэння спрачаюцца са сваяком з суседняй краіны, каму жывецца лепш, адказ шукаюць не ў статыстычных справаздачах, а ў побыце. Якую атрымліваюць зарплату, колькі аддаюць за жыллё і што могуць купіць у крамах.

«НН» вырашыла разабрацца з трэцім прадметам спрэчак з пералічаных і параўнала цэны на кошык прадуктаў у звычайных прадуктовых крамах суседніх сталіц — у Мінску, Маскве, Кіеве, Вільні і Варшаве. Колькі каштуюць хлеб, малако, бульба, яйкі, каўбаса, яблыкі з бананамі і, нарэшце, сок. З усяго асартыменту абіралася самая нізкая цана, але пад увагу не браліся зніжкі і распродажы, бо яны не заўсёды дакладна адлюстроўваюць стан рынку.

### Беларусы сядзяць на хлебе і малацэ

Нездарма, выпраўляючыся ў госці да сваякоў, беларусы вязуць з сабой пару боханаў «Нарачанскага» хлеба. Мала таго, што смачна, дык яшчэ і нядорага! Маскоўскі хлеб даражэйшы ў паўтара разу, непадалёк ад яго і варшаўскі з віленскім.

Беларусь славіцца яшчэ і як малочнае каралеўства. Нягледзячы на стратнасць малаказаводаў, дзяржава трымае цэны нізкімі. Дзяржаўную падтрымку сельскай гаспадаркі бэсцяць эканамісты-лібералы, але насельніцтва цешыцца. 1560 рублёў за літр — удвая танней, чым у Маскве! Тым самым улады даюць магчымасць існаваць аршанска-смаленскім малочным цягнікам. Выпраўляючыся штодзень на рынак у Расію, абвязаныя авоськамі са смятанай беларускія бабулькі робяць добры бізнэс. Больш зарабляюць толькі падпяразаныя спіртам у пакетах і цыгарэтамі «чаўнакі», якія ездзяць у Літву і Польшчу.

### Краіна бульбы без бульбы

Як краіна, якую называюць бульбяной, прадае мараканскую бульбу замест сваёй — асобная тэма. Як і тое, што мясцовыя карняплоды не адпавядаюць патрабаванням таго ж «Макдональдса». Але факт застаецца фактам — па бульбу мінчукам можна выпраўляцца ў Кіеў ці Вільню. Там за кілаграм трэ будзе заплаціць менш за тысячу рублёў. Вядома ж, мех бульбы правезці праз мяжу будзе складана.

Здаецца, калі б палякам дазволілі заваліць усе суседнія краіны яблыкамі — яны б гэта зрабілі. 1740 рублёў за кілаграм — гэта не пабітая і недаспелая садавіна, а вялікія чырвоныя прыгажуны. Смешна сказаць, але яблыкі ў Польшчы таннейшыя за бульбу. Іншая садавіна — апельсіны з бананамі — таксама каштуе ў палякаў менш, чым у суседзяў. У тую ж катэгорыю здаровага харчавання можна аднесці і сокі.

**Цэны ў гарадскіх прадуктовых крамах (у беларускіх рублях)**

| | хлеб (1 кг) | малако (1 л) | бульба (1 кг) | яйкі (10 штук) | вараная каўбаса (0,5 кг) | яблыкі (1 кг) | бананы (1 кг) | апельсінавы сок (1 л) | Агульны кошт |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Мінск | 2030 | 1560 | 1100 | 4300 | 6100 | 3930 | 4500 | 2900 | 26420 |
| Масква | 3010 ↑ | 2970 ↑ | 1600 ↑ | 3710 ↓ | 7240 ↑ | 4060 ↑ | 5020 ↑ | 3020 ↑ | 30630 |
| Кіеў | 2280 ↑ | 2190 ↑ | 820 ↓ | 4190 ↓ | 6370 ↑ | 2530 ↓ | 4870 ↑ | 2830 | 26080 |
| Вільня | 2750 ↑ | 2640 ↑ | 920 ↓ | 4980 ↑ | 7870 ↑ | 2080 ↓ | 4640 ↑ | 3100 ↑ | 28980 |
| Варшава | 2800 ↑ | 2580 ↑ | 1780 ↑ | 4020 ↓ | 5570 ↓ | 1740 ↓ | 3120 ↓ | 2750 ↓ | 24180 |



### Замест мяса — яйкі

Нягледзячы на шматлікія скаргі расіян на няякаснае мяса, іх цэны нават на такую не надта смачную каўбасу вельмі высокія. Паўкілаграма варанай — у якой часам няма ніякага мяса, а толькі адна соя — абыдзецца ў 7240 рублёў. Паляк за тыя ж грошы купіць сабе не 500, а 650 грамаў каўбасы.

Адзінае, чым могуць ганарыцца расіяне — яйкі. У гэтай намінацыі яны атрымалі заслужанае першае месца. Праўда, адзінае. Усе астатнія прадукты ў Маскве даражэйшыя, чым у Мінску.

### Залатая сярэдзіна

Такім чынам, параўнаем кошыкі. Самы танны ён аказаўся ў Варшаве — 24 180 рублёў.

Мінск і Кіеў прыкладна на адным узроўні — па 26 тысяч рублёў.

Віленскі кошык цягне амаль на 29 тысяч. А вось шматмільённая Масква нездарма лічыцца дарагім горадам — заканамернае апошняе месца ў рэйтынгу з 30600 рублёў.

Праўда, акцыі і распродажы, якія мы прадбачліва не ўлічвалі, кажуць не на карысць беларускай сталіцы. Сокі — вось, у прынцыпе, і ўсё, на што пакупнікі могуць атрымаць зніжкі ў Мінску. 1990 рублёў за літр — норма для беларускіх гіпермаркетаў.

У астатніх сталіцах інакш. Віленцы часам жывуць ад распродажу да распродажу. «Уваходзім ў гіпермаркет і бачым — сёння 50%-я зніжкі на курыцу, рыс і шакалад. Значыцца, на бліжэйшы тыдзень наша меню прадвызначанае», — смяюцца студэнты Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта.

А вось заробкі і кошт жылля ў гарадах — пытанні, якія таксама істотна ўплываюць на дабрабыт насельніцтва, стануць тэмамі наступных параўнальных аналізаў.

**Яўген Васількоў**

# Падалі ў суд на Расію

Беларусь пайшла на папулісцкі крок, каб яшчэ раз паспрабаваць адмяніць мыту на нафту.

25 сакавіка Беларусь звярнулася ў Эканамічны суд СНД. Наша краіна мае прэтэнзіі да Расіі — маўляў, тая збірае мыты на нафту насуперак заключаным раней пагадненням наконт свабоднага гандлю. Спрэчка цягнецца з пачатку года, і няма ніякіх падстаў для яе вырашэння. Беларусь патрабуе адмяніць мыты, Расія спасылаецца на ўнутранае заканадаўства і прапануе пачакаць стварэння адзінай эканамічнай прасторы.

Пазоў быў успрыняты расійскім бокам спакойна. У першую чаргу таму, што мала хто верыць і ў судовае вырашэнне праблемы. Напрыклад, першы віцэ-прэм'ер Расіі Ігар Шувалаў мяркуе, што вынясенне прысуду будзе адцягвацца: «Мне здаецца, нам удасца дасягнуць пагаднення па фармаванні адзінай эканамічнай прасторы, у выніку чаго экспартныя мыты будуць адменены яшчэ да таго, як суд прыме рашэнне. Спрэчка патрабуе доўгага часу. А пакуль што мыты будуць працягваць збірацца».

Тое, што беларускі бок нават не апублікаваў дакументаў, з якімі звярнуўся ў суд, дае падставы меркаваць, што галоўная задача пазова — прыцягненне ўвагі грамадскасці, а не вырашэнне праблемы. Больш за тое, статут эканамічнага суда СНД не прадугледжвае абавязковасць выканання рашэння. Суд можа толькі парэкамендаваць баку, які прайграе, ліквідаваць парушэнні.

**ЯВ**

**Што такое Эканамічны суд СНД?**

Суд знаходзіцца ў Мінску. Старшыня — прадстаўнік ад Таджыкістана. Складаецца з пяці суддзяў, ад Расіі і Беларусі па адным чалавеку. Апроч іх — таджык, казах і кіргіз.

# Ладуцька: пакінем у Мінску прыватны сектар

24 сакавіка выканаўца абавязкаў мэра Мінска Мікалай Ладуцька даў прэс-канферэнцыю, на якой акрэсліў перспектывы сацыяльна-эканамічнага развіцця сталіцы.

### Пра памеры Мінска

Да 2011 года Мінгарвыканкам пачне пракладку інжынерных камунікацый за межамі МКАД. У 2012 мусяць з'явіцца першыя дамы. Новымі мікраёнамі стануць Шчомыслiца, Тарасава і Дзегцяроўка. Рыхтуюцца да рэалізацыі і планы наконт гарадоў-спадарожнікаў. Мікраёны пабудуюць каля Смалявіч, Заслаўя і Лагойска.

### Пра інвестыцыі ў новае будаўніцтва

Сёлета ў сталіцы нарэшце пачне будавацца аквапарк. Інвестара для яго ўсё яшчэ не знайшлі.

А вось ахвотныя ўзвесці ў Мінску жалезабетонны завод знайшліся. Грошы дасць Кітай. Таксама азіятаў зацікавіла будаўніцтва ў мікрараёне «Лябяжы». Яны гатовыя даць сродкі на ўзвядзенне там мінскага «чайнатаўна».

### Пра льготныя крэдыты на жыллё

Пастанова №101, якая дазваляе мінчанам атрымліваць ільготны крэдыт на будаўніцтва жылля незалежна ад часу пастаноўкі ў чаргу, будзе працаваць і далей. Мінгарвыканкам прыйшоў да чарговага кампрамісу ў дыялогу з «Беларусбанкам».

### Аб прыватным сектары

Калі было прынята рашэнне максімальна скарацiць прыватны сектар у сталіцы, прыйшло 8 тысяч зваротаў ад мінчан, якія выступілі супраць. Урэшце Мінгарвыканкам адступіў. Ад ранейшай ідэалогіі адмаўляюцца. І дазволяць будаваць індывідуальныя жылыя дамы.

### Пра перайменаванні вуліц

«У нас ёсць спецыяльная камісія, якая і разглядае такія пытанні. Кожны чалавек можа ўнесці свае прапановы. Калі казаць як грамадзяніну, а не як мэру, я лічу, што ў дынамічны час нічога не павінна стаяць на месцы. Трэба прызнацца, што ў нас былі ўдалыя гістарычныя перайменаванні», — заявіў Мікалай Ладуцька.

**ЯВ**

# Польшча і Расія падзеляць беларускі страхавы рынак?

Тады з'явіцца доўгачаканая канкурэнцыя.

Пасля таго, як тыдзень таму «Росдзяржстрах» заявіў пра планы стварыць у Беларусі даччыную кампанію, актывізаваліся і палякі. Прычым калі расіяне захацелі пачаць з нуля, як у свой час рабілі іншыя падраздзяленні ўсходніх кампаній, то Польшча гатовая адразу купіць «Белдзяржстрах».

Пра цікавасць палякаў да лідэра беларускага рынку паведамілі расійскія СМІ. Польская кампанія PZU звярнулася ў беларускую кампанію з прапановай аб яе магчымай куплі ў выпадку акцыянавання. Пакуль што «Белдзяржстрах» застаецца ўнітарным прадпрыемствам, лідэрам страхавога рынку са зборамі $200 мільёнаў. У кампаніі працуе каля 6000 чалавек.

Нядаўна ўрад прыняў пастанову аб пераўтварэнні «Белдзяржстраха» і яго «дачкі» па страхаванні жыцця, кампаніі «Стравіта», у акцыянерныя таварыствы. Акцыянаванне мае адбыцца ў 2010 годзе.

Польская PZU — найбуйнейшы страхаўшчык Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, кантрольны пакет акцый кампаніі належыць дзяржаве. 23% акцый PZU трымае нідэрландская страхавая група Eureko.

Рынак страхавых паслуг Беларусі лічыцца надзвычай перспектыўным. За мінулы год 24 кампаніі, якія зарэгістраваны ў Беларусі, агулам зарабілі $370 мільёнаў, прычым рынак працягнуў рост, нягледзячы на сусветны фінансавы крызіс.

**ЯВ**

# Збіраем новыя крэдыты

Беларусь спадзяецца атрымаць яшчэ некалькі мільярдаў даляраў ад Кітая і МВФ.

Першы мільярд ужо знойдзены. Яго паабяцаў беларусам намеснік старшыні Кітайскай Народнай Рэспублікі Сі Цзіньпін на сустрэчы з Лукашэнкам. Сродкі павінны пайсці на рэалізацыю супольных праектаў. Акрамя таго, «у знак дружбы» кітайскі ўрад вылучыць у 2010 годзе Беларусі бязвыплатную дапамогу памерам 60 мільёнаў юаняў (каля $8,8 млн).

Чакаецца падтрымка і з боку Міжнароднага валютнага фонду. Фінансісты абмяркоўваюць з уладамі Беларусі магчымасць рэалізацыі новай праграмы stand-by. Яе арыенціровачны тэрмін складзе ажно тры гады, паведаміла сталая прадстаўніца МВФ у Беларусі Наталля Калядзіна. Пры гэтым беларускі бок прапаноўвае адразу дамовіцца на пяцігадовую спонсарскую дапамогу. Для атрымання грошай Беларусь мусіць выконваць чарговыя заданні па лібералізацыі эканомікі. Канкрэтныя памовы будуць весціся ў маі.

На цяпер агульны памер дапамогі МВФ склаў каля $3,46 мільярда.

**ЯВ**

# «Нам у міліцыі такія не патрэбныя, якія ідуць супраць сваіх»

**У «НН» напісаў былы курсант Акадэміі МУС Дзяніс Бяляк з Навагрудка. Гісторыя нібыта банальная — куфаль піва ў звальненні, сутычка з хуліганамі, пастарунак, суд, адлічэнне з вучобы. Дзяніс лічыць, што яго з сябрамі пакаралі незаконна і ў адстойванні сваіх правоў дайшоў да Вярхоўнага суда.**

«Часта мы чуем з экрана тэлевізара прыгожыя словы пра дэмакратыю ў нашым грамадстве. Зараз я хачу расказаць аб тым, што адбываецца на самай справе ў нашай (дэмакратычнай) дзяржаве», — піша 19-гадовы Дзяніс Бяляк.

Што ж прымусіла маладога чалавека, які з дзяцінства марыў стаць міліцыянтам і ўжо зрабіў першыя крокі насустрач задуманаму, прыйсці да нечаканай высновы, што «ў нашай дзяржаве зручней зрабіць чалавека вінаватым і не даць яму магчымасці апраўдацца»? Вось што пра гэта кажа сам Дзяніс.

У сутачнае звальненне 12 верасня 2009 г. ён, другакурснік Акадэміі МУС, прыехаў у Навагрудак. Выпіў з сябрамі куфаль піва. На вуліцы да іх прычапілася пара нецвярозых маладзёнаў. Канфлікт скончыўся бойкай і пастарункам. І хоць зачыншчыкамі былі нецвярозыя маладыя людзі, дарэчы, раней судзімыя, у райаддзеле ўсё пайшло не так. Калі Бяляк паспрабаваў нешта патлумачыць у РАУСе, то афіцэр міліцыі сказаў яму літаральна наступнае: «Змоўч, смаркач, шмат ты ведаеш, навучылі законам цябе ў акадэміі, зараз мы табе пакажам закон». Пры гэтым з нецвярозай парачкай міліцыянты размаўлялі як са знаёмымі. Дзяніса з сябрамі праверылі на алкаголь і пакінулі начаваць у ізалятары часовага ўтрымання. А іхніх крыўдзіцеляў... адпусцілі.

### «Павярхоўная, як і суд»

Раніцай Дзяніса выклікалі да ўчастковага Валянціна Рагулі і паставілі ўмову: пакуль не падпішаш пратакол, з ізалятара не адпусцім. Дзяніcу ж трэ было вяртацца ў акадэмію. Пратакол ён падпісаў і прыклаў да яго тлумачальную з падрабязным апісаннем здарэння. Перад ад'ездам у Мінск яго адвялі да намесніка начальніка РАУС Генрыха Бараноўскага. Той пры Дзянісавых бацьках нібыта заявіў, што «нам у міліцыі такія не патрэбныя, якія ідуць супраць сваіх і вучаць сваіх сяброў не падпісваць пратаколы». Курсант з'ехаў, а яго сябры засталіся ў ізалятары яшчэ на суткі. Аднаго з іх, Дзяніса Жарнака, з абвастрэннем гастрыту шпіталізавалі. Дзякуючы гэтаму, ён не падпісаў пратакол.

На суд Беляка не адпусцілі. Справу яго разгледзелі надзвычай хутка. Тлумачальнай Дзяніса суд не ўзяў пад увагу, блытаніну ў паказаннях міліцыянтаў таксама. Увогуле, цягам судовай эпапеі супрацоўнікі ППС не адзін раз будуць змяняць свае паказанні, кажа былы курсант. Тое самае было і з ягонымі сябрамі. Хлопцаў абвінавацілі ў дробным хуліганстве і пакаралі штрафам у 70 тысяч рублёў. 7 кастрычніка Беляка адлічылі з акадэміі.

«Службовая праверка была такая самая павярхоўная, як і суд», — гаворыць Дзяніс. Сябры звярнуліся ў пракуратуру Навагрудскага раёна, згадаўшы ў скарзе пра Жарнака, які быў з імі 12 верасня, але ў суд не трапіў. Жарнак пратакол не падпісаў, але яго ўсё адно засудзілі. Малады чалавек падаў скаргу ў Гродзенскі абласны суд і быў апраўданы. У судзе высвеліліся характэрныя падрабязнасці. Так, на пытанне суддзі, чаму Кейнін і Хвінько (маладзёны, што напалі на Беляка з сябрамі) былі адпушчаныя дамоў пасля інцыдэнту, супрацоўнік Навагрудскага РАУС патлумачыў, што яны былі... непрытомныя. Самі ж маладыя людзі заявілі суду, што памятаюць толькі, як пілі ў бары гарэлку і па дарозе дамоў трапілі ў міліцыю.

Раённая пракуратура адмовіла Дзяніcу і яго сябрам, тое ж зрабіла і абласная, хоць на той момант акурат апраўдалі Жарнака. Пра гэта сябры напісалі ў Генпракуратуру, але там, як і ў абласной і раённай пракуратуры, ім адказалі, што іх віна пацвярджаецца адміністрацыйнымі пратаколамі, падпісанымі імі ж. І паўсюль праігнаравалі іх тлумачэнне, што пратаколы былі падпісаныя ў выніку ціску. Не далі плёну звароты ў Гродзенскі абласны суд, у Адміністрацыю Лукашэнкі.

«Я з маленства марыў стаць міліцыянтам. Мае стрыечныя браты служаць у войску і міліцыі. Гэта ў нас сямейнае», — кажа Дзяніс. У акадэміі ён вывучаў правы. Цяпер ён рыхтуецца паступіць на юрыдычны факультэт аднаго з мінскіх універсітэтаў.

Хлопец мяркуе, што навагрудскія міліцыянты папомсціліся яму за тое, што ён паспрабаваў абараніць сябе і сваіх сяброў, адгаворваючы іх падпісваць пратаколы.



**Дзяніс Бяляк хацеў быць міліцыянтам, пакуль не трапіў у міліцыю.**

### «У нас такіх спраў шмат»

У РАУС Навагрудка пра гісторыю з Беляком ужо забыліся. Прынамсі, участковы Валянцін Рагуля паведаміў толькі, што ў мясцовых міліцыянтаў, у прыватнасці ў камандзіра ППС Вячаслава Касцюка, і раней былі праблемы з Беляком. Але падрабязнасцяў участковы не прыгадаў. Вячаслаў Касцюк не змог успомніць падрабязнасці восеньскага інцыдэнту. Не прыгадаў ён і ранейшых канфліктаў з Беляком. «У нас такіх спраў шмат, усё ў галаве не ўтрымаеш», — сказаў камандзір ППС.

У гісторыі Беляка цяжка разабрацца да канца. Верыцца ў тое, што камандзір ППС можа не памятаць дробнага хуліганства паўгадавой даўнасці — на жаль, такіх справаў і сапраўды шмат.

У гісторыі выклікае неўразуменне, чаму віну за бойку панёс толькі адзін бок, тым больш што другі таксама быў нецвярозы.

Можна дапусціць, што, трапіўшы ў непрыемную сітуацыю, хлопец выкарыстаў атрыманыя ў Акадэміі юрыдычныя веды, чым дапёк супрацоўнікаў РАУС. Ах ты так, то зарабі. Яшчэ горш, калі Кейнін і Хвінько былі знаёмымі кагосьці з міліцыянтаў, што дзяжурылі ў той дзень (гэта вынікае са словаў Беляка). Дзяніс і яго бацькі ўказваюць на шматлікія парушэнні, дапушчаныя пры складанні пратаколаў, на разыходжанні ў паказаннях супрацоўнікаў ППС, на тое, што затрыманых запалохвалі.

Зрэшты, пра такія гісторыі можна пачуць ці не ў кожным раёне. Тое і страшна.

**Сямён Печанко**

# Латарэя Латушкі пацясніла «Ваша лато» і «Суперлато»

**Сродкі ад «Скарбніцы» пойдуць на рэканструкцыю Навагрудскага замка.**

Супрацоўнікі «Беларусбанка» атрымалі інструкцыю — цяпер наведвальнікам банка трэба перадусім прапаноўваць латарэйныя білеты «Скарбніцы». «Ваша лато» і «Суперлато» пакуль што адышлі на другі план.

Частка грошай ад рэалізацыі білетаў спецыяльнай латарэі «Скарбніца» мусіць пайсці на аднаўленне Навагрудскага замка. Гэта была асабістая ініцыятыва міністра культуры Паўла Латушкі. «Набыўшы адзін білет «Скарбніцы», вы дадаеце дзве цаглінкі для рэканструкцыі замка», — гучыць слоган акцыі. Білет, дарэчы, каштуе 2500 рублёў, а ўсяго іх надрукавана 36 тысяч. Са сродкаў, сабраных ад продажу «латарэек», каля 50% будзе пералічвацца на рахунак рэканструкцыі. Атрымліваецца, што тыраж «Скарбніцы» дасць $15 тысяч.

Сістэма распаўсюду любых латарэйных білетаў такая: кожнае аддзяленне банка бярэ частку білетаў на распаўсюд. За некалькі дзён да правядзення розыгрышу непрададзеныя «латарэйкі» вяртаюцца арганізатарам. Са «Скарбніцай» склалася іншая сітуацыя. Па банках быў разасланы ліст за подпісам першага намесніка міністра культуры Уладзіміра Рылаткі.



МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
МИНИСТЕРСТВО КУЛЬТУРЫ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

Праспект Пераможцаў, 11, 220004, г. Мінск

Тэлефон (017) 203 75 74
Факс (017) 203 90 45
e-mail: minkult@kultura.by

01.03.2010 № 11-05/761/1
На № ____

Председателю правления
ОАО АСБ «Беларусбанк»
Ермаковой Н.А.

О лотерее «Скарбніца»

Уважаемая Надежда Андреевна!

Министерство культуры с 2002 года является учредителем республиканской тиражной лотереи «Скарбніца», все средства от которой в соответствии с Положением о порядке осуществления лотерейной деятельности на территории Республики Беларусь, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 4 мая 2007 г. № 209 «О лотерейной

У ім чыноўнік нагадвае, што «наступленне сродкаў на правядзенне рэстаўрацыйна-ўзнаўляльных мерапрыемстваў... залежыць ад колькасці прададзеных білетаў» і просіць «аказаць садзеянне ў актыўнай рэалізацыі латарэйных білетаў». У дадатак, зварот да «паважанай Надзеі Андрэеўны» — старшыні праўлення «Беларусбанка» Надзеі Ермаковай — утрымлівае просьбу «магчымага ўдзелу ў акцыі» самога банка.

У «Беларусбанку» просьбу ўспрынялі з усёй адказнасцю. Як расказаў карэспандэнту «НН» супрацоўнік аднаго з мінскіх аддзяленняў банка, кіраўніцтва паведаміла супрацоўнікам: «Непрададзеных латарэйных білетаў застацца не павінна. Вяртаць не будзем ніводнага білета».

**Яўген Васількоў**





# 1 красавіка ў Мінску распачнецца месячнік суботнікаў

У цэнтры сталіцы ладзяцца пікеты, удзельнікі якіх заахвочваюць мінакоў прыняць удзел у выбарах у мясцовыя саветы, а таксама ў традыцыйных вясновых суботніках.

Адзін з такіх пікетаў можна было пабачыць 26 сакавіка каля кінатэатра «Мір» на вуліцы Казлова. Яго зладзілі супрацоўнікі і студэнты Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта. Маладыя людзі трымалі дзяржаўны сцяг, а таксама сцягі сваёй ВНУ. Яна раздавалі ўлёткі з інфармацыяй пра выбары і запрашэнні прыняць удзел у «традыцыйным месячніку па ўборцы, добраўпарадкаванні і азеляненні тэрыторыі горада». У запрашэнні гаворыцца, што распачнецца гэты месячнік 1 красавіка. Яго арганізатары, сярод іншага, вельмі разлічваюць на дапамогу працоўных калектываў, грамадскіх аб'яднанняў і палітычных партый, а таксама ўсіх неабыякавых.

Неабыякавых знаходзілася мала. Дакладней, зусім не знаходзілася.

**СП**

# Расія зноў ваюе

Піша **Алесь Чайчыц** — карэнны масквіч беларускага паходжання.

Навіны пра тэракты чамусь успрымаюцца больш абвострана, калі ты далёка ад горада, дзе яны адбываюцца, чым калі ты там. Падчас выбухаў каля метро «Рыжская» ў 2004 годзе ці побач з гатэлем «Нацыяналь» у 2003 годзе я быў у Маскве і чамусь тэрарыстычныя атакі не выклікалі вялікага страху. Магчыма, гэта было нейкае пачуццё фаталізму ці, наадварот, аблягчэнне, што ты быў там, але, дзякаваць Богу, быў далёка ад месца выбуху, хаця праз станцыю «Рыжская» я тады ездзіў штодзень.

З іншага боку, у дзень выбуху паміж станцыямі «Аўтазаводская» і «Павялецкая» я знаходзіўся ў Саратаве, і ўжо было вельмі неспакойна за сваіх блізкіх у Маскве. Як і цяпер.

Магчыма, гэта таксама эфект ад таго, што выбух здарыўся ў метрапалітэне — гэтай містычнай і інтымнай частцы Масквы, месцы, дзе ты больш за ўсё судакранаешся з ёю на шляху з дому на працу ці інстытут. Метро — частка шматгадовай штодзённай руціны соцень тысяч жыхароў мегаполіса. Цырыманіяльна год за годам гучаць у вушах заклінанні: «Осторожно, двери закрываются, следующая станция — Парк культуры». Магчыма, здалёк усё глядзіцца страшней і адтуль складаней змірыцца з тым, што здарылася, чым калі ты побач.

Непрадухілены тэракт азначае, што адказныя людзі не справіліся са сваёй працай і павінны быць пакараныя. Павінна працаваць правіла: «Не справіўся з адказнасцю — пакідаеш пасаду». Так што прэзідэнту Расіі варта было б думаць пра ратацыю ў кіраўніцтве спецслужбаў, ФСБ ці МУС. Але ж мы з вамі ўсё разумеем, праўда?

Расія працягвае ваяваць. І не толькі яна — у Лондане ў метро не працуе мабільная сувязь — я так разумею, гэта нязручнасць з'яўляецца наступствам тэрарыстычнай атакі 2005 года.

Панядзелкавыя выпадкі нагадалі, як смерць і гора могуць увarвацца і ў наша камфортнае мяшчанскае жыццё. Дый не толькі ў выглядзе тэракта, але і іншымі, куды больш празаічнымі шляхамі. Нам застаецца быць па-самурайску гатовымі да ўсяго.

**Тэракты ў маскоўскім метро**

**8 студзеня 1977.** Выбух у цягніку між станцыямі «Ізмайлаўская» і «Першамайская». Загінулі 7 чалавек і яшчэ 37 параненыя. Вінаватымі прызналі 32–гадовага Сцяпана Зацікяна і двух ягоных сяброў з падпольнай Нацыянальнай вызваленчай партыі Арменіі. Усіх іх пакаралі смерцю.

**11 чэрвеня 1996.** У цягніку між станцыямі «Тульская» і «Нагацінская» спрацавала самаробная бомба. Выбухоўка была закладзеная пад сядзенне. Загінулі 4 чалавекі, 14 былі параненыя.

**8 жніўня 2000.** Выбух у пераходзе на Пушкінскай плошчы. Загінулі 13, параненыя 118 чалавек. Выбуховае прыстасаванне, начыненае шрубкамі, было пакінутае ў гаспадарчай сумцы побач з гандлёвымі павільёнамі.

**5 лютага 2001.** Спрацавала бомба, закладзеная пад мармуровую лаву на платформе станцыі «Беларуская». Лава і ўратавала людскія жыцці. Пацярпела каля 20 чалавек.

**6 лютага 2004.** Раніцай у гадзіну пік на перагоне між «Аўтазаводскай» і «Павялецкай» тэрарыст–смяротнік прывёў у дзеянне магутнае самаробнае выбуховае прыстасаванне. Ураджэнец Карачаева–Чаркесіі Анзор Іжаеў забіў 41 чалавека і звыш 250 параніў. ФСБ Расіі назвала арганізатарам тэракта былога курсанта вайсковай вучэльні Паўла Касалапава.

**Канец жніўня 2004.** Тэрарыстка–смяротніца ўзарвалася на ўваходзе ў станцыю метро «Рыжская». Загінулі 10 чалавек.

**29 сакавіка 2010.** Ад выбухаў на станцыях «Лубянка» і «Парк культуры» загінулі 38 чалавек.

**Сямён Печанко**



## «Людзі страшна крычалі»

Працяг са старонкі 1.

Сіла выбуху была такая, што дзверы вагона імгненна выгнуліся.

Выбух на станцыі «Парку культуры», дзе сыходзяцца дзве напружаныя лініі метро — Сакольніцкая і Кальцавая, адбыўся праз 50 хвілін, у 8.40. «Я адчуў на сабе вібрацыю. Пачуўся выбух, было шмат дыму... Людзі страшна крычалі», — паведаміў сведка.

Тысячы людзей, што ехалі той раніцай на працу і вучобу праз цэнтр Масквы, пабачылі жудасныя карціны. «Сустрэў 5 чалавек у крыві і якіхсьці частках цела ў валасах. Жанчына ўся ў крыві ляжыць каля вестыбюля Сакольніцкай, на «Парку культуры», — такія запісы часта трапляліся ў блогах масквічоў.

Няпэўныя звесткі пра выбух выклікалі паніку ва ўсім метро. У інтэрнэце паведамляецца, што «на станцыі «Камсамольская» ёсць пацярпелыя, якіх проста задушылі ў натоўпе». Калі рух метро спыніўся, гэтым скарысталіся таксісты. Цэны за праезд між чатырма станцыямі выраслі ў разы. Праўда, неабыякавыя грамадзяне арганізавалі бясплатны развоз пасажыраў.

У вышук абвешчаныя яшчэ дзве меркаваныя тэрарысткі — на відэакамерах бачна, што яны суправаджалі смяротніц да ўваходу ў метро.

Хоць следства ўжо пачало неафіцыйна гаварыць пра «каўказскі след», ні адна з груповак партызанаў пакуль не ўзяла адказнасці за іх.

У маскоўскім метро пацярпела і адна грамадзянка Беларусі, 30-гадовая Вольга Рудэнка.

**Сяргей Мікулевіч**

### КАМЕНТАР

**Масква ў галаве**

Дзіўна глядзяцца спробы беларускага начальства пераносіць у Мінск маскоўскія праблемы. «Да асобага распараджэння сталічная міліцыя будзе несці службу ва ўзмоцненым рэжыме», — дакладвае МУС. Але ж Беларусь не вае на Каўказе і тэракты з каўказскім следам ёй не пагражаюць. Дык чаго бударажыць людзей?

# Някляеў пад забаронай

Адразу дзве ўстановы — Галерэя «Ў» і Акадэмія мастацтваў — адмовілі яму ў памяшканні пад вечарыны.

Спачатку пісьменніку адмовілі ў памяшканні для прэзентацыі яго паэтычнага зборніка «Кон» у мінскай галерэі сучаснага мастацтва «Ў». Адмову патлумачылі тым, што ў іх на гэтыя дні, 24—25 сакавіка, запланаваны іншыя мерапрыемствы. Маўляў, звязана гэта з прыездам еўрапейскіх партнёраў. Хоць папярэдняя дамоўленасць на залу была. Прэзентацыю пісьменнік правёў, але ў іншым месцы.

28 сакавіка ў зале Акадэміі мастацтваў планавалі правесці літаратурную вечарыну, прымеркаваную да вяртання з конкурсу «Еўрапейскі паэт свабоды» Уладзіміра Арлова. Але арганізатарам адмовілі ў памяшканні. Абгрунтавалі адмову тым, што ў гэты дзень зала будзе занятая.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

«Я не чуў сам, мне толькі пераказвалі, што калі адміністрацыя паглядзела спіс удзельнікаў вечарыны і ўбачыла там прозвішча Някляева, то адмовіла ў зале», — кажа Уладзімір Някляеў **(на фота справа)**.

Гэта ўжо не першыя забароны літаратурных вечарын, удзел у якіх мусіў браць Някляеў. 17 сакавіка сталічны Палац мастацтва адмовіў у зале для прэзентацыі «Беларускага кнігазбору».

Нагадаем, што Някляеў нядаўна стаў ініцыятарам грамадскай кампаніі «Гавары праўду».

**Кастусь Матушыч**

### ЗДАРЭННІ

## КДБ правёў новы арышт

Затрыманы следчы цэнтральнага апарата Дэпартамента фінансавых расследаванняў КДК. У Цэнтры інфармацыі і грамадскіх сувязяў (ЦІГС) КДБ пакуль не даюць інфармацыі па гэтай справе. Як сказаў начальнік ЦІГС КДБ Аляксандр Антановіч, яшчэ не паступала каманда кіраўніцтва на тое, каб агалошваць гэты факт. Пагаворваюць, што ўзялі следчага па падазрэнні ў атрыманні хабару. Гаворка ідзе пра стаўленніка цяперашняга намесніка дырэктара ДФР КДК Віктара Марозава.

## Светлагорскі падлетак асуджаны за згвалтаванне трох мужчын

Ён прыгавораны да пяці з паловай гадоў пазбаўлення волі за ўчыненне гвалтоўных дзеянняў сексуальнага характару ў дачыненні да трох мужчын — 18, 54 і 60 гадоў. Суд прызнаў падлетка вінаватым таксама ў рабаванні, бо ў пацярпелых ён забраў грошы.

У пракуратуры адзначылі, што двое з пацярпелых, 1956 і 1949 гадоў нараджэння, вялі асацыяльны лад жыцця.

На судзе сваю віну падлетак не прызнаў і сказаў, што ўсё адбывалася добраахвотна.

## 81 крымінальная справа на махляра

Мясцовы Астап Бэндэр падмануў случчакоў на 340 мільёнаў рублёў. Ён збудаваў фінансавую піраміду, якая дазваляла яму нябедна жыць і прайграваць грошы ў казіно.

Слуцкі прадпрымальнік пазычаў грошы ў знаёмых, абяцаючы вярнуць з працэнтамі. Некаторым пазыкі вяртаў, займаючы грошы ў іншых бізнесменаў. Адзін знаёмы пазычыў яму 25 тысяч даляраў!

Акрамя таго, прадпрымальнік браў замовы на выраб мэблі. Людзі аддавалі стопрацэнтную перадаплату, але ні мэблі, ні грошай больш не бачылі.

Круцяля пасадзілі на сем гадоў.

## У беларуса канфіскавалі скарбы

Грамадзянін Беларусі намагаўся вывезці з Украіны гісторыка-культурныя каштоўнасці. У яго рэчах знайшлі 91 манету, самая ранняя з якіх датуецца 1578 годам, 13 грашовых банкнот, 37 паштовак. Пасажыр цягніка «Сімферопаль-Мінск» не задэклараваў гэтых набыткаў. Таму ўкраінская мытня іх канфіскавала.

**«Ежедневник»; БелаПАН; «Інфа-Кур'ер»**

# Каго «замочаць у сарціры»?

Выбухі ў Маскве адразу выклікалі ў памяці серыю выбухаў у Расіі ў 1999 годзе. Піша **Віталь Тарас**.



Тады ў выніку падрыву жылых дамоў у Буйнакску, Маскве і Валгадонску загінулі больш за 300 чалавек.

Паводле афіцыйнай версіі, міжнародныя тэрарысты Хатаб і Абу-Умар, якія дзейнічалі ў Чачні, выкарысталі для арганізацыі тэрактаў групу карачаеўцаў на чале з Гачыяевым. Пяць гадоў таму члены гэтай групы Дзекушаў і Крымшамхалаў былі прызнаныя вінаватымі і асуджаны ў Маскве. (Яны адбываюць пажыццёвае пакаранне, Гачыяеў знаходзіцца ў федэральным вышуку.)

Ёсць і шмат неафіцыйных версій. Паводле адной з іх, да тых тэрактаў спрычыніліся расійскія спецслужбы. Паведамлялася, напрыклад, што ў падвале дома ў Разані знайшлі мех з гексагенам (гэтае рэчыва выкарыстоўвалася ў папярэдніх выбухах). Мясцовае аддзяленне ФСБ заявіла, што гэта былі ўсяго толькі вучэнні і што ў мяху быў цукар.

У 2001 годзе на Захадзе выйшла кніга «ФСБ узрывае Расію». Адным з яе суаўтараў быў Аляксандр Літвіненка, пазней атручаны ў Лондане радыеактыўным цэзіем.

Ва ўсякім разе, тэракты 1999-га паслужылі дадатковым апраўданнем для Крамля, каб развязаць другую Чачэнскую вайну. А рэйтынг Уладзіміра Пуціна, які ў жніўні ўзначаліў расійскі ўрад (перад гэтым ён быў кіраўніком ФСБ), вырас да нябёсаў, і ў сакавіку 2000-га ён без праблем перамог на прэзідэнцкіх выбарах. Пачалася пуцінская эпоха.

Нягледзячы на абяцанне Пуціна мачыць тэрарыстаў у сарціры, якое ён даў на самым пачатку свайго прэзідэнцтва, тэракты ў Расіі за апошнія дзесяць гадоў адбываліся неаднойчы, у тым ліку ў Маскве.

Як бы тое ні было, гэтыя тэракты — выклік цяперашняму прэзідэнту Мядзведзеву. Барацьба за ўладу, якая ўвесь час адбываецца паміж рознымі групоўкамі пад коўдрай, апошнім часам стала яўнай нават для людзей, далёкіх ад палітыкі. Дайшло да таго, што прэзідэнт публічна заявіў аб невыкананні чыноўнікамі некаторых яго распараджэнняў і папярэдзіў іх аб адказнасці. А тут яшчэ заклікі да мадэрнізацыі, спроба рэфармаваць сілавую структуру — МУС і г.д. Палітыка Мядзведзева, несумненна, выклікае вялікую незадаволенасць прынамсі часткі атачэння Пуціна. Яны хацелі б пэўных гарантый для яго перамогі на прэзідэнцкіх выбарах 2012 года.

Як паўплываюць маскоўскія выбухі на ўнутраную і замежную палітыку Расіі — пабачым бліжэйшым часам.

Што тычыцца ўладаў Беларусі, дык тэракты дазваляюць ім, як быццам, выкарыстаць сітуацыю ў вузкапрапагандысцкіх мэтах: глядзіце, маўляў, як усё добра і стабільна ў нас і як кепска — у Расіі. Неяк па-новаму, дарэчы, гучаць пасля тэрактаў у Маскве словы кіраўніка мінскай міліцыі Фармагея, якія ён прамовіў перад мітынгам апазіцыі 25 Сакавіка. Ён казаў, быццам нейкія экстрэмісцкія элементы з Расіі рыхтуюць правакацыю накшталт той, што адбылася ў сталіцы Беларусі 3 ліпеня...

Зразумела, гэта ўсяго толькі супадзенне. Дый нельга параўнаць выбух пакета з-пад соку з падрывамі на станцыях метро, ахвярамі якіх сталі дзясяткі людзей. А вось хто атрымаў выгаду ў абодвух выпадках — іншая справа.

Падзеі ў Маскве самі сабою трагедыя. Але яшчэ больш сур'ёзнымі ўжо цяпер падаюцца наступствы гэтых падзей, у тым ліку, у перспектыве, і для адносінаў Беларусі з Расіяй.

# Хто забіў тэрарыстак?

Бурную дыскусію на сайце «НН» выклікаў каментар манаха–дамініканца **Пётры Рудкоўскага**.



Ад выбуху на станцыях «Лубянка» і «Парк Культуры» прайшло ўжо колькінаццаць гадзін, прагучала мноства спачувальных слоў і асуджальных усклікаў. Вернікі моляцца і слёзна ўздыхаюць, правадыры трасуць кулакамі, радыкал-патрыёты качаюць мускулы, боль і адчай змешваюцца з нянавісцю і прагай помсты.

Хто забіў тэрарыстак? — такое нетыповае пытанне хачу паставіць з гэтай нагоды. Ці лепш: *што* іх забіла?

Смерць гэтых 38-мі наступіла пасля смерці тых дзвюх, якія здзейснілі самазабойчы тэракт. Але гэтая смерць у іх выпадку павінна была наступіць значна раней. Павінна было быць нешта, што знішчыла ў іх жыццё, забіла жаданне жыць і любіць. Хто альбо што іх забіла? Дзе бярэ пачатак гэты жудасны вірус смерці-ў-імя-нянавісці? І ці ёсць антыдот?

Пакіньма ўбаку праблему пачаткаў. Што тычыцца проціяддзя — яно ёсць. Некаторыя прэзентуюць яго пад фірмовай маркай INRI*, але пазначыць варта, што яно ніколі не было апатэнтавана, таму кожны можа займацца яго прадукцыяй і карыстацца без усякіх абмежаванняў. Смерць Ісуса Назарэйскага на крыжы. Смерць, якая знішчае смерць. Смерць-у-імя-любові.

Яны проста не захацелі падставіць «левай шчакі».

Што такое смерць-у-імя-любові? Азначае яна знішчэнне ўнутры сябе асяродкаў зла і нянавісці. Бываюць сітуацыі, калі вызваленне ад нянавісці з'яўляецца цяжэйшым, чым фізічная смерць. Я не ведаю біяграфій тых асоб, якія здзейснілі тэракты ў Маскве. Але ведаю, што многія жанчыны ў Чачні згубілі сваіх мужоў і сыноў, што былі неадназова гвалчаны і прыніжаныя «па законах вайны», што, будучы згвалчаныя «ворагам», становяцца таксама адкідамі ў сваіх супольнасцях. Становяцца жывымі забітымі. Перакананы, што сённяшнія «гераіні тэрору» належалі да гэтай катэгорыі жанчын.

Як знішчыць у сабе пульсуючую нянавісць у *такой* сітуацыі? Вызваліцца ад гэтай нянавісці і сапраўды можа быць цяжэй за фізічную смерць. Аднак гэта магчыма, калі ёсць у душы вера ў сілу любові. А калі ёсць сувязь з Тым-Хто-Знішчыў-Смерць (маецца на ўвазе смерць-нянавісць), то магчымае становіцца рэальным...

Некаторыя смяюцца, чуючы евангелічныя словы: «Калі хтосьці ўдарыць цябе ў правую шчаку, падстаў яму і левую». Тыя, хто легкадумна пакепліваюць з гэтых слоў, хай усур'ёз падумаюць, што было глыбіннай прычынай гэтага (і не толькі) тэракта. Падумайце, шаноўныя. Так, сённяшнія тэрарысткі нічога асаблівага не зрабілі. Яны атрымалі спаўна ў правую шчаку і сказалі: хопіць.

* Расшыфроўваецца гэта: Iesus Nazarenus Rex Iudaicus.

# Музей, які засеў у каляіне



Раўбічы. Гэтае месца ведамае беларусам найперш дзякуючы купюрам у 5 000 рублёў... Піша **Сяргей Харэўскі**.

Купюрам, на якіх выяўлены алімпійскі спартыўны комплекс. Нядаўна тут выбухнуў канфлікт паміж Мастацкім музеем і вернікамі-каталікамі парафіі суседняй вёскі Аколіца. Прадметам спрэчкі стаў будынак Музея народнага мастацтва. Гэта былы касцёл Святога Мацея.

Айцец Ігар Лашук, галоўны ініцыятар вяртання касцёла вернікам, кажа, што для гэтае парафіі, у Раўбічах, ужо выраблены абраз Халяўшчыцкае Маці Божае, што некалі ўратавала тутэйшага шляхціца Лукаша Халяву, які стаў у 1640 годзе першым фундатарам тутэйшае святыні.

Але, як высветлілася падчас навуковай канферэнцыі «Праблемы аховы і інтэрпрэтацыі помнікаў гісторыі і культуры. Узаемадзеянне грамадскасці і дзяржавы», што прайшла ў Раўбічах у сакавіку, пытанне аб вяртанні касцёла вернікам пакуль афіцыйна нават не ставілася.

Калі ў 1970-я аскабалкі колішняга касцёла апынуліся на тэрыторыі алімпійскага спарткомплексу «Раўбічы», храм удалося выратаваць цудам, размясціўшы тут Музей народнага мастацтва. Сёння тут захоўваюцца сапраўдныя скарбы: скульптуры і абразы, унікальныя царскія вароты, сплеценыя з саломы, адзіны ў Беларусі аўтэнтычны поўны Віцебскі народны строй...

Але выдатна складзеная і аформленая пры канцы 1970-х экспазіцыя з таго часу мала змянялася. Даўно не рабіліся экспедыцыі, не праводзіліся мэтавыя закупы.

Фонды папаўняюцца спарадычна і выпадкова. Напрыклад, ксёндз Ёзас Булька ў свой час падараваў музею колькі ўзораў народнага ганчарства... Музей не мае сваіх буклетаў, праспектаў, паштовак, нават старонкі ў інтэрнэце... Які б музей ні быў выдатны на свой час, сёння ён выглядае анахранічна.

Можна зразумець клопат руплівцаў старасвеччыны, якія баяцца, што і гэты музей можа напаткаць лёс музеяў у Заслаўі і Гродне, ліквідаваных у выніку перадачы іх будынкаў царкве. Можна зразумець і непакой супрацоўнікаў за свае працоўныя месцы... Але, далібог, дзіўнавата глядзіцца музей, што месціцца ў касцёле пры могілках, у атачэнні спартовых канструкцыяў.

Месца Музею беларускага народнага мастацтва — у сталіцы.

Дабірацца сваім ходам сюды няпроста. Развіваць музей няма як. Ладзіць там, напрыклад, фальклорныя фэсты няма каму... Ізноў жа, сярод могілак. Месца Музею беларускага народнага мастацтва — у сталіцы. А там пазнаёміць з традыцыйным народным мастацтвам няма як. Камуністы ў свой час хавалі гэтыя скарбы далей ад новых пакаленняў беларусаў, звозячы іх да турыстычнай забаўкі пры спарткомплексе... Гэты музей, як і многія іншыя нашыя найкаштоўнейшыя зборы, засеў у каляіне між часоў. Ні ўзад ні ўперад.

Зрэшты, ніхто сёння і не збіраецца вырашаць лёс музея ў Раўбічах. Няма ані палітычнае волі, ані належных сродкаў, каб узняць яго статус і ўдыхнуць новае жыццё. Роўна як ніхто ў агляднай перспектыве не верне гэты будынак Касцёлу. Але канфлікт падкрэслівае лішні раз недасканаласць нашага заканадаўства, дзе не прапісаны механізм вяртання/невяртання культавых будынкаў.

Што яшчэ турбуе — лёс такіх асяродкаў нацыянальнае культуры, як Музей народнага мастацтва, няпэўны пры адсутнасці на дзяржаўным узроўні ўцямнае нацыянальнае ідэалогіі... Ці мала што тут могуць зрабіць з мэтай падвышэння рэнтабельнасці. Таму варта скарыстацца магчымасцю ды пад'ехаць у Раўбічы.

Там вельмі прыгожа: горы, парослыя старым лесам, страсвецкі касцёл між крыжоў на гары, і ў ім — цудоўны музей.

# Наш дзень

## Дзве тысячы чалавек выйшлі ў Мінску на святкаванне Дня Волі.




Міліцыя не ўжывала супраць дэманстрантаў сілы. Акцыя была пазітыўная і зараджала добрым настроем.

Сёлета ў горадзе перад акцыяй 25 Сакавіка не адчувалася такой напружанасці, як мінулыя гады. Спецтэхнікі і спецназа ў дварах было нямнога, спіраляў Бруна ці загараджальных шчытоў не было відаць. Цэнтр горада не перакрываўся.

Часткова гэта было таму, што акцыю санкцыянавалі. Гарадскія ўлады далі дазвол на збор каля Акадэміі навук. Потым яны прапанавалі дэманстрантам прайсці да плошчы Бангалор, але ў арганізатараў было сваё меркаванне.

Перад пачаткам мерапрыемства начальнік мінскай міліцыі Леанід Фармагей абвясціў, што, паводле аператыўнай інфармацыі, «замежнымі грамадзянамі» рыхтуюцца падзеі накшталт тых, што адбыліся 3—4 ліпеня 2008 года — выбух ля стэлы «Мінск горад-герой». Фармагей прасіў удзельнікаў акцыі быць пільнымі і прыглядацца да навакольных, а таксама аказваць дапамогу міліцыі ў затрыманні злачынцаў.

У нефармальнай размове міліцыянты дадаюць, што гэтыя людзі прыехалі з Расіі. Цікава, што раней жа палохалі «баевікамі» з Украіны і Грузіі. Міліцыя таксама мела на руках аркушы паперы з арыенціроўкай (прыкметамі чалавека, які прыляцеў сёння ў мінскі аэрапорт).

Прысутнічалі на акцыі і прэс-афіцэры, якія павінны былі адказваць за працу прадстаўнікоў СМІ. Журналісты дзяржаўных СМІ не адыходзілі ад іх ні на крок.

Як заўсёды, актыўнай была моладзь. Хлопцы і дзяўчаты з «Маладога фронту», «Моладзі БНФ», «Маладой Беларусі», «Вольнай моладзі», «Правага альянсу», «Еўрапейскай Беларусі» былі самымі арганізаванымі. Яны мелі з сабой сцягі, расцяжкі. Моладзь першай падхоплівала скандаванне «Жыве Беларусь», а потым яно разыходзілася між шэрагаў.



Моладзь не ўпусціла нагоды размяцца на праспекце.

Не абышлося і без пэўнай экзотыкі. На ўскрайку акцыі пашыхтаваліся хлопцы з лысымі галовамі, абутыя ў берцы, — «Белая воля». Расцяжкі яны мелі досыць арыгінальныя: «Спорт. Вернасць. Гонар. Кроў.», «Не — дэмакратыі, капіталізму, камунізму», «Сыны Перуна». На апошнім адлюстраваныя Пагоня на зялёным шчыце, аўтаматчык і салярная сімволіка.

Потым гэтыя юнакі ў адзіноце накіраваліся на Бангалор. Ніякіх сутычак яны не правакавалі.

Лідэр Партыі БНФ Аляксей Янукевіч пачаў мітынг з хвіліны маўчання па пісьменніку Кастусю Тарасаву, з якім развіталіся ў гэты самы дзень. Таксама Янукевіч абвясціў пра пачатак месячніка салідарнасці, у часе якога будуць збірацца грошы для хворых дзяцей.

Вячаслаў Сіўчык успомніў, што ў гэтыя дні адбываецца судовы працэс над Мікалаем Аўтуховічам. Ён заклікаў праваабарончыя арганізацыі перагледзіць сваё стаўленне да гэтых вязняў.

Уладзіміру Някляеву яўна падабалася ўвага журналістаў і маніфестантаў. Ён выступаў эмацыйна, з надрывам. Казаў, што сённяшняя ўлада пабудаваная на татальнай хлусні, і, каб яе перамагчы, трэба гаварыць праўду.



Раней палохалі «баевікамі» з Украіны, цяпер — «бомбамі» з Расіі.



Сценка на сценку?

А вось Андрэй Саннікаў разам з жонкай Ірынай Халіп увесь мітынг стаяў у натоўпе, да мікрафона не рваўся. Таксама і Алесь Міхалевіч. Мілінкевіч у гэты дзень быў у Брусэлі, а Лябедзька не паспяваў на мітынг пасля суда ў Валожыне.

Выступаў было не так і шмат. Пры канцы сустаршыня БХД Аляксей Шэін прапанаваў людзям стаць са сцягамі ўздоўж праспекта, пасля чаго разыходзіцца. То бок быў скарыстаны леташні сцэнар.

Панаваў добры настрой. Акцыя прайшла ў разняволенай, святочнай атмасферы. Было нямала сямей з дзецьмі. Сілы аховы парадку паводзілі сябе карэктна.

Праўда, невялікая сутычка са спецназам ледзь не адбылася на скрыжаванні праспекта з вуліцай Петруся Броўкі. На шчасце, і ва ўдзельнікаў, і ў міліцыі хапіла вытрымкі не ісці на абвастрэнне. Затрыманні ў гэты дзень выглядалі б недарэчна.

А ўжо пасля мітынгу людзі разышліся па дамах і барах у коле сям'і ці сяброў працягваць адзначаць свята Незалежнасці. Хай для беларусаў 25 Сакавіка яшчэ не набыло такога размаху, як для ірландцаў Дзень святога Патрыка, але гэта наш дзень і наша свята.

**Зміцер Панкавец, фота Юліі Дарашкевіч**

радыё свабода
Тэл. (017) 266 39 52
СМС 391 22 24
svaboda@rferl.org
п/с 111, Менск, 220005, Беларусь

ад 28 сакавіка – новыя частоты, хвалі

| | | |
|---|---|---|
| 06:00-08:00 | 6105 кГц<br>6120 кГц | 49 м<br>49 м |
| 18:00-20:00 | 7270 кГц<br>9725 кГц | 41 м<br>31 м |
| 20:00-22:00 | 6050 кГц<br>6105 кГц | 49 м<br>49 м |
| 22:00-24:00 | 5995 кГц<br>9405 кГц | 49 м<br>31 м |

612 кГц 490 м сярэднія хвалі

www.svaboda.org

**У аэрапорце? У машыне? У метро? Чытай pda.nn.by з мабільніка**

Трымайце руку на пульсе pda.nn.by, дзе б Вы ні былі.

nn.by штодзённа забяспечвае аператыўныя і аб'ектыўныя навіны, ясныя каментары і аналітыку, аўтарскае відэа і фота. Усім гэтым Вы можаце карыстацца з мабільнага тэлефона. Праз ПДА–версію Вы можаце сачыць за навінамі і каментарамі, ашчаджаючы трафік. Яна зручная і сціслая.

# Мора між Стоўбцамі і Новым Свержанем

У Беларусі — найбольшая за 30 гадоў паводка.

Вялікія снягі гэтай зімы зрабіліся вялікай вадой, перапоўніўшы беларускія рэкі. Вось і Нёман разлўся. Тут, паміж Стоўбцамі і Новым Свержанем, ён хоць і хуткаплынны, але нешырокі. Аднак цяпер, калі з палёў сышоў снег, рака разлілася і падтапіла абодва мястэчкі. Здаецца, што да самых дамоў падступіла мора.

Выратавальнікі ідуць у абыход уздоўж прырэчнай часткі горада. Вады — дзе па калена, а дзе па пояс, а дзе і глыбей — але туды можна ўжо толькі на чаўнах. А пару дзён таму вада стаяла яшчэ вышэй. Яна ж нанесла на падворкі купы смецця ды саломы. Паводка будзе каштаваць гаспадарам немалых грошай. Яны, як могуць, спрабуюць ратаваць маёмасць. Ірына Хведараўна, якая жыве ў доме па вуліцы Шчорса, з сумам аглядае свой падворак, які нагадвае басейн. У такія дні ў яе з'яўляецца жаданне з'ехаць ад той ракі куды падалей. Ратавальнікі перыядычна адпампоўваюць ваду з затопленых дамоў, але стыхія бярэ сваё. Увесь Нёман не адпампуеш. Застаецца чакаць, пакуль пачне спадаць вада. Мясцовыя жыхары кажуць, што такой паводкі тут не было трыццаць год.

Да Таццяны, суседкі Ірыны Хведараўны, таксама завітаў у госці Нёман. І за час гасцявання знішчыў усе запасы гэтай спадарыні. «Шкада бульбы», — хапаецца яна за галаву, аглядаючы заліты вадой склеп. Гаспадыня застрахавала толькі хату, а пра іншую маёмасць і не падумала.

На другім беразе Нёмана, у Новым Свержані, вуліца Стаўпецкая сама ператварылася ў раку. Хаты стаяць пустыя, гаспадароў няма. Затопленыя падворкі выглядаюць вусцішна. Людзей з дамоў эвакуявалі. Дый не дзіва — як тут цяпер жыць, калі нават з хаты выйсці няма як. Застаецца толькі чакаць, пакуль спадзе вялікая вада. Тады, нарэшце, Нёман адшукае свае берагі, і жыццё вернецца ў звычайнае рэчышча. Да наступнай паводкі.

А пакуль над Нёманам кружляе першы бусел — нібы альбатрос над марскім абшарам.

**Алесь Кудрыцкі, фота Юліі Дарашкевіч**







## Уладзімір Арлоў атрымаў прэмію «Еўрапейскі паэт свабоды»

Гэта адна з самых грашовых літаратурных прэмій Еўропы.

Прэмія, заснаваная муніцыпалітэтам польскага горада Гданьск, была ўручаная 27 сакавіка. Арлоў прадстаўляў Беларусь на агульнаеўрапейскім конкурсе «Еўрапейскі паэт свабоды» з кнігай вершаў «Паром праз Ла-Манш».

Сярод намінантаў былі паэты з Польшчы, Кіпра, Славакіі, Славеніі, Сербіі, Францыі, Швецыі. З 46 еўрапейскіх краін для ўдзелу былі выбраныя восем. З кожнай краіны-фіналіста выбралі па адным паэце, чыю кніжку пераклалі і выдалі папольску.

Кнігу Арлова перастварыў папольску славуты перакладчык Адам Паморскі. Лаўрэата чакае прэмія ў памеры 100 000 злотых (33 000 даляраў).

**КМ**



**«Наша Ніва»: Ці прыязна сустракала прадстаўніка беларускай літаратуры польская публіка?**

**Уладзімір Арлоў:** На круглым стале ў выглядзе своеасаблівага токшоу па праблемах свабоды творчасці, цэнзуры і самацэнзуры, які праходзіў 25 сакавіка (у ім сярод іншых узялі ўдзел знакамітыя дысідэнты і літаратары: чэх Іржы Груша і літовец Томас Венцлава, паляк Рышард Крыніцкі), быў незабыўны момант. У канцы сустрэчы вядоўца, адзін з ідэолагаў «Салідарнасці» Адам Міхнік сказаў, што сёння беларусы святкуюць Дзень Волі, і зала наладзіла Беларусі і беларусам колькіхвілінную авацыю...

**«НН«: Цяпер, па вяртанні, якія планы?**

**УА:** Рыхтую да выдання працяг кнігі «Адкуль наш род» для падлеткаў. Калі ў папярэднім выданні аповед спыняўся на 1918 г., дык цяпер я распавяду пра падзеі і асобаў усяго XX ст., у тым ліку пра нашых сучаснікаў: Уладзіміра Караткевіча, Ларысу Геніюш, Васіля Быкава... Назва новай кнігі пакуль што абмяркоўваецца з самім сабой, але будзе нешта сугучнае папярэдняму выданню. А яшчэ нараджаюцца новыя тэксты з цыкла «Полацкія апавяданні». І — вершы.

**«НН»: Яшчэ раз віншуем вас, спадар Уладзімір, з перамогай!**

**УА:** Дзякуй «Нашай Ніве» і ўсім, хто павіншаваў мяне гэтымі днямі. Увогуле лічу сваю прэмію ўзнагародай для ўсёй нашай літаратуры.

**Лявон К.**

## «Глебаўка» без даху

Ідзе знос будынка Мастацкага вучылішча імя Глебава (вул. Хмяльніцкага, 5).

Знікае адзін з адрасоў беларускай культуры XX стагоддзя.

Яго паставілі яшчэ да вайны, увадначассе з першымі будынкамі Політэхнічнага інстытута. Па вайне там месціўся фінансава-эканамічны факультэт, пасля гандлёвы тэхнікум. А ў 1979-м сюды перабралася мастацкае вучылішча.

«Глебаўка» была адной з самых аўтарытэтных мастацкіх школаў Беларусі. Тут вучыліся народныя мастакі Міхаіл Савіцкі і Ізраіль Басаў, Васіль Шаранговіч, Леанід Шчамялёў... І наступнае пакаленне — Глобус і Сіўчыкаў, Кашкурэвіч і Анемпадыстаў. У сутарэннях будынка рэпетавала легендарная «Мроя». А колькі выдатных творцаў было тут настаўнікамі — цяжка злічыць: Малішэўскі, Грамыка, Басальга, Маркавец, Купава, Васюк, Мацievіч... Сюды прыязджалі вучыцца з усіх куткоў Беларусі, з Калінінграда і Смаленска, з Украіны і Літвы. Але й паступіць было няпроста. Конкурсы былі высокімі, не раўнуючы, як у інстытут.

Мастацкая вучэльня была адным з наймацнейшых нацыянальных асяродкаў Мінска. Менавіта яе навучэнцы ў 1984 годзе, падчас знішчэння будынка першага мінскага тэатра, выйшлі пратэставаць з расцяжкаю «Руйнуюць помнік беларускае культуры!». У кастрычніку 1985-га на будынку два навучэнцы — Уладзімер Макееў і Міхал Мірошнікаў — вывесілі на даху Глебаўкі нацыянальныя сцягі.

Цяпер вучэльня адселеная з легендарнага будынка. У ім вядзецца, паводле дакументаў, рэканструкцыя. Пытанне: ці вернуць пасля будынак мастакам, якія ўжо другі год туляюцца немаведама дзе? Не дзіва: месца ў цэнтры горада казырнае, а з вучэльні, разумеюць чыноўнікі, вялікага «навару» не будзе...

Муры палаца, што перажылі вайну, дзе некалі былі й слёзы й смех, каханне й творчае трымценне, дзе здараліся сапраўдныя радасці і сапраўдныя трагедыі, ужо амаль разбураны. А разам з імі знікае й памяць пра тое, як паўставала, дужэла і змагалася нашае мастацтва.

**Сяргей Харэўскі**



Чэргі ў царкву ў Мінску на Вербніцу.

PHOTO.BYMEDIA.NET

## Прычым казакі да Вербніцы?

Сёння я выйшаў у царкву, якая ў маім мікраараёне Малінаўка, побач з перакрыжаваннем вуліцаў Ясеніна і Касманаўтаў, каб пасвянціць вярбу з нагоды Вербнай нядзелі. І вось што мяне асабіста абурыла.

Каля царквы быў вялікі натоўп наведнікаў, якія таксама прыйшлі купіць вербавых галінак і таксама іх пасвянціць. Аднак акрамя звычайных наведнікаў было шмат нейкіх незразумелых дзядзькоў у незразумелай чорнай форме і без бэджаў. Частка з іх магла быць байцамі АМАПа ці яшчэ якой спецбрыгады МУС РБ, а частка была апранутая ў форму, падобную да чорнай амапаўскай, аднак з лампасамі і ў фуражках з зялёнымі акольшкамі, з чаго можна было зрабіць выснову пра прыналежнасць іх да «ражаных»–казачкоў. Таксама у дворыку царквы было з тузін пубертатных падлеткаў, якім «не паложана па сроку службы» нават зяпу разяваць на старэйшых, у такой самай чорнай нібыта форме, якія, гыркаючы на наведнікаў «Атайдзі туда», «Раўняемся», «Атадвіньцесь», быццам бы рэгулявалі натоўп, а насамрэч яшчэ болей уносілі бязладзіцу і псавалі ўражанне ад урачыстасці. З гэтае нагоды ўзнікае некалькі пытанняў:

1) Ці не трымаюць вернікаў за быдла, якое самое не ў стане стаць роўна, калі ідзе святар і свенціць вярбу?

2) Ці царкоўны дворык — месца для ігрышчаў у «ражаных» і ці не блытаюць яны царкоўны двор з вайскова–спартовым лагерам для дапрызыўнікоў ці тусоўкай ралевікоў, дзе большасці гэтых асобаў самае месца, беручы пад увагу іх век?

3) Ці адпавядае ўдзел гэтых «ражаных» у ахове парадку дзейнаму заканадаўству Рэспублікі Беларусь?

«Атайдзі туда», «Раўняемся», «Атадвіньцесь» — у царкве.

4) Які статус у гэтых казачкоў, і якое дачыненне яны маюць да Беларусі, Беларускай Праваслаўнай Царквы і ці не ёсць гэта элементам палітычнай гульні, у той час калі царква мусіць быць па–за палітыкай?

5) Ці не думаюць у БПЦ, што запрашэнне на ўдзел такіх вось «ражаных» можа сеяць варажнечу і непрыхільнасьць сярод вернікаў? А што калі іншыя праваслаўныя захочуць апрануцца шляхтай, якая абараняла краіну ад тых казачкоў у XVII ст.?

6) Ці не ёсць змешванне мілітарнасці і царкоўнасці наследаваннем традыцыі тэўтонскіх псоўрыцараў, якія вынішчалі праваслаўных славянаў?

7) Ці нармальна для мірнай і стабільнай Беларусі прыцягненне незразумелых ралевікоў для ўдзелу ў такіх святочных урачыстасцях?

8) Чаму з аднаго боку беларуса чакае паляк–ксёндз, а з іншага — поп–расіец, чаму няма беларускіх святароў для беларусаў? Ці мы не зрабілі высноваў з гісторыі?

**Яшка Цыган, баец КПЗБ, Мінск**

## Паводка ў Івянцы

**Адсутнасць ліўневай каналізацыі амаль штогод прыводзіць да падтаплення шэрагу жылых дамоў на вуліцы Юбілейнай у Івянцы.** Больш за трыццаць гадоў жыхары гэтай вуліцы дамагаюцца ад мясцовай улады адводу ліўневых і талых водаў і штораз атрымліваюць абяцанні развязаць праблему. А вось у гістарычным цэнтры Івянца, якія не разбурылі сучасным будаўніцтвам, да гэтага часу спраўна працуе ліўневая каналізацыя, пабудаваная, як тут кажуць, яшчэ за польскім часам.

**Вінцэнт Солтан, Івянец**




Беларусы Маямі (Фларыда, ЗША) адзначылі Дзень Волі вясёлым пікетам салідарнасці.

## Дзень Волі ў Канзасе

**25 сакавіка выкладчыца Надзея Сычугова правяла адкрыты занятак у Паўднёва-заходнім каледжы ў г. Уінфілд, штат Канзас, з нагоды святкавання 92-й гадавіны Дня Волі.** Мерапрыемства было праведзенае ў межах курса «Гісторыя і культура Беларусі». Тэматыка занятку і дата самым цудоўным чынам супалі з адным з найважнейшых дзён у гісторыі Беларусі XX стагоддзя.

Падчас лекцыі амерыканскія студэнты даведаліся пра гісторыю стварэння Беларускай Народнай Рэспублікі, яе лёс, а таксама пра існаванне ўрада БНР, які да гэтага часу дзейнічае ў эміграцыі. Студэнтаў уразіў той факт, што яны неаднойчы маглі бачыць на тэрыторыі кампуса жанчыну паважанага ўзросту ў элегантным шэрым гарнітуры, якая з'яўляецца дзейным прэзідэнтам Рады БНР, — Івонку Сурвіллу. Яна была ўдзельніцай разнастайных мерапрыемстваў, арганізаваных Цэнтрам беларускіх даследаванняў.

Спадарыня Надзея апавяла пра сучасны стан Беларусі. У якасці прыкладу яна расказала пра свой асабісты досвед удзелу ў святкаванні Дня Волі: толькі дзякуючы хуткасці сваіх ног ды раптоўна адчыненым дзвярам пад'езда яна не была арыштаваная спецназам. Гэты аповед выклікаў буру эмоцыяў з боку студэнтаў.

Пасля быў прадэманстраваны дакументальны фільм Уладзіміра Арлова і Юрыя Хашчавацкага «Дзень Волі». Студэнты паглыбіліся ў зусім не знаёмую амерыканскаму ўспрыняццю атмасферу падзеяў Першай сусветнай вайны, вір Кастрычніцкай рэвалюцыі і ўмоваў абвяшчэння незалежнасці БНР. Пабачылі на ўласныя вочы, як адбываецца святкаванне Дня Волі на вуліцах Мінска.

**Прысутная, Уінфілд (ЗША)**

## Вось пра што думаецца…

**А.Р.Лукашэнку цяпер 55.** Ягонаму малодшаму Колю — 5. Згодна з нашай Канстытуцыяй, прэзідэнтам краіны можа быць выбраны грамадзянін Рэспублікі Беларусь не маладзейшы за 35 гадоў. Калі ж «падкарэктаваць» адпаведны артыкул Канстытуцыі, знізіўшы гэтую лічбу да 30–ці, тады Колю застанецца чакаць не 30, а 25 гадоў, калі ягонаму бацьку споўніцца 80. Для палітыкаў высокага рангу гэта дапушчальны ўзрост. Мы ведаем прыклады, пераважна дыктатараў, якія не хацелі выпускаць уладу з рук, — Фідэль Кастра, Кім Ір Сэн, Броз Ціта, Пінач эт, Франка… А хіба ж Лукашэнка горшы?

**Міхаіл Жукаў, Баранавічы**

## Абуджэнне

Айчына дачакаецца вясны,
Спяшаюцца на Бацькаўшчыну буслы —
У родны край — азёрны і лясны,
Дзе люд нясе гасцінны беларускі
Духмяны хлеб на свой абрус льняны.
Айчына дачакаецца вясны.

Ужо папрачыналіся сыны,
І жаваронкаў галасы, як гуслі.
У баразне — каняка вараны,
Ён паслухмяны, не патрэбны цуглі,
Кілім зялёны ўнізе ля сасны,
Ужо папрачыналіся сыны.

Я з пачуццём пяшчоты і віны
Каханую пацалаваў у вусны,
Гучалі запрашальныя званы,
У храмавай урачыстай цішыні
Малітвы дасылалі Ісусу,
Нам не пазбыцца пачуцця віны.

Забегалі паўпанкі і паны,
Энтузіязм — фальшывы і пратухлы,
Для папаўнення казачнай казны
У казіно — заселі бараны,
А груганы — зноў на заморскай кухні,
Злякаліся — паўпанкі і паны.

**Алесь Сакалоў, Баркалабава (Магілёўская вобласць)**

## Сцяг

*Сяргею Каваленку*

Калі з вяршыні сцяг зрывалі,
Узнесены туды героем на руках,
Апошнюю надзею адбіралі,
Каб у сэрцах нашых пасяліўся страх.

А сцяг ляцеў, крыляў,
Як птах падбіты, з неба падаў,
Нібы крывёю ён сцякаў,
На чысты снег, на хмурныя прысады.

Ён уніз ляцеў, зусім бяссільны,
У знямозе крылы апускаў,
І вецер, плачучы ад крыўды,
Пяшчотна крылы падтрымаў.

**Святлана, Ліда**

## Дзень Волі

Мы прыйдзем на Плошчу сёння,
Каб разам адзначыць Падзею —
Дзень Беларускае Волі,
Народзіны нашай Надзеі.

На Плошчы імя Каліноўскага
Адчуеш ты сэрцам, павер,
Вялікае Княства Літоўскае,
І Полацак, і БНР!

Краіны Дабра і Ззяння,
Краіны Культуры, Асветы,
Краіны Святога Змагання —
Свабоды адчуеш паветра!

Бо ёсць Беларусь у нашых сэрцах,
У нашых жаданнях, малітвах,
І дзеля Яе нам памерці
Не будзе ні страшна, ні крыўдна.

**Вадзім Мохаў, Мінск**

«НН» з радасцю друкуе ў газеце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаванні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы не можам пацвярджаць атрыманне Вашых лістоў, не можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адраса. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Мінск.
e-mail: nn@nn.by.
Факс: (017) 284-73-29**



У ролі Радзівіла Пане Каханку — Расціслаў Янкоўскі. Фота з генеральнай рэпетыцыі.

# Крэдыт для голага караля

«Пане Каханку» — новы відовішчны спектакль у тэатры ім Горкага. Піша **Сяргей Мікулевіч**.

27 сакавіка ў Горкаўскім тэатры прайшла прэм'ера спектакля паводле п'есы Андрэя Курэйчыка «Пане Коханку». Менавіта так, праз гіперкарэктнае «о» стаіць на афішах. Хоць у цэлым гэтай пастаноўкай тэатр пацвердзіў статус Нацыянальнага драматычнага.

Спектакль пачынаецца сцэнай адрачэння Радзівіла. З высылкі ён піша ліст да расійскай царыцы Кацярыны: просіць дазволу вярнуцца ў родны Нясвіж за абяцанне «не займацца палітыкай».

Бо Караль Станіслаў Радзівіл сам хацеў быць каралём Рэчы Паспалітай, замест марыянеткавага Станіслава Аўгуста Панятоўскага, каханка Кацярыны. Гэтым у многім тлумачыцца тое, чаму гісторыкі пасля так упарта ляпілі з Пане Каханку вобраз дзівака і блазна.

Адзіны рэальны гістарычны факт, на якім будуецца п'еса, — візіт Панятоўскага ў Нясвіж.

Паводле п'есы, Панятоўскі прыязджае браць крэдыт «на пяць гадоў пад каралеўскае слова». Фінансавыя магчымасці караля цудоўна ўвасабляе сцэна мыцця ў ванне. А матывацыя будзе да болю знаёмая сённяшнім голым каралям: крэдыт трэба, каб ратаваць Рэч Паспалітую. Але палымяныя заклікі да адзінства і патрыятызму не кранаюць багатага Радзівіла. «Это не наречие. Это язык», — кідае Радзівіл Панятоўскаму, калі той спрабуе падлашчыцца, сказаўшы тост «на местном наречии». Пане Каханку расплюшчвае вочы здзіўленаму Панятоўскаму: тут — Беларусь. Беларусам пляваць і на Маскву, і на Варшаву. Тут свой рытм, амбіцыі будаўнікоў імперый абыякавыя людзям гэтай зямлі. А яшчэ — Радзівіл адразу зразумеў, што новы кароль задробны душой, каб пайсці ў сваёй справе да канца.

Аўтары не імкнуліся стварыць новыя вобразы. Яны стварылі запамінальныя. Таму Пане Каханку — гэта крыху стары Вежа з «Каласоў пад сярпом тваім»: у сваіх дзівацтвах, складаных платанічных пачуццях да маладой акторкі Алесі (успомнім, у Вежы таксама быў тэатр). Але найбольш Курэйчыкаў Радзівіл — гэта Мюнхгаўзен. Прычым гэта барон не з кніжкі Распэ, а з фільма «Тот самый Мюнхгаузен» Разанава. Уплыў савецкага кінематографа прарываецца не толькі тут. Шчымлівая фінальная сцэна палёту крыху нагадвае адпаведную з «Сказки странствий» Міты.

Скразная ідэя п'есы — навучыць беларусаў лётаць. Гэтым займаецца Караль Радзівіл у Нясвіжы, даўшы зарок не браць удзелу ў палітыцы. «Палёт» чытаецца як метафара пазбаўлення ад комплексу нацыянальнай непаўнавартасці.

Але яскравыя акцэнты, зародкі сюжэтных ліній у п'есе трэба вылоўліваць. Яны зацярушаныя саладжавымі народалюбскімі развагамі, вялізнай колькасцю іншай мішуры. Рэжысёр Андрэй Курэйчык вядомы як стваральнік сцэнароў для паспяховых расійскіх кінасерыялаў. І ён пастараўся, каб у гэта п'есе было ўсё: і лінія кахання, і элементы спецыфічнага тэатральнага капусніка (паказальна, што сцэну рэпетыцыі радзівілаўскага тэатра разумелі хіба прафесійныя акторы), і цэлыя музычныя нумары, прычым беларускамоўныя, — арыі з твораў Мацея Радзівіла, песня Лявона Вольскага «Пане Каханку».

> Сцэны прыніжэння Панятоўскага ў Нясвіжы выклікалі б асацыяцыі ў сённяшніх вышэйшых дзяржаўных асобаў.

Выпадковасць частак сюжэта кампенсуецца сілай супутных эфектаў — то пададбранай музыкай, то вынаходкамі пастаноўкі.

«Пане Каханку» — сярод самых відовішчных спектакляў года. Ён мае ўсе шанцы доўга збіраць аншлагі ў Горкаўскім: модны рэжысёр, папулярная гістарычная тэма, якасная пастаноўка.

Сцэны прыніжэння, якія Панятоўскі зазнае ў Нясвіжы, спадзеючыся на крэдыт, выклікалі б, пэўна, багаты асацыятыўны шэраг у сённяшніх вышэйшых дзяржаўных асобаў.

Нечаканае вытлумачэнне ў гэтым ракурсе набываюць і дзівацтвы Пане Каханку, апісаныя гісторыкамі. Так, яго загад гандлярам залезці на дрэвы і каркаць варонамі, меў на мэце праверыць, ці згодны чалавек на прыніжэнне за тры рублі. «Аказваецца — могуць!» Разлік адбываецца на вачах Панятоўскага, які ўсё чакае ад Пане Каханку крэдыту...

Спецыяльна для Панятоўскага Пане Каханку ладзіць нават парадыйную «бітву з расійцамі», якая насамрэч выяўляецца стральбой набоямі з солі па тых гандлярах.

Пасля Панятоўскі знаходзіць выпадак адыграцца асабіста. Пад канец п'есы праціставнне караля ў фальшывым золаце і князя ў простым бела-чырвоным строі чытаецца ўсё ясней.

Фінал — інсцэнізаваная бітва пры Гібралтары на нясвіжскіх сажалках. Падчас сапраўднай Гібралтарскай бітвы галандцы вырвалі незалежнасць у іспанскіх заваёўнікаў. Нашы героі — толькі гледачы. Гэтым відовішчам Радзівіл нібыта сцвярджае сваю маральную перамогу, хоць жыццёвую паразу ад Панятоўскага і падобных яму атрымаў.

Зрэшты, не толькі маральную: крэдыту Радзівіл каралю так і не даў. Цікава: ці была б сёння Беларусь, калі б даў? Во гэтак Андрэй Курэйчык зрабіў Пане Каханку бацькам нацыі.

**Наступныя паказы:** 11, 16 і 29 красавіка.

## Алесю Марачкіну — 70

30 сакавіка 70 гадоў споўнілася мастаку Аляксею Марачкіну. Ягоныя творы — адна з вяршыняў беларускага мастацтва XX і XXI ст. Аўтар «Плошчы Каліноўскага» прызнаецца, што яго натхняе — дыктатура. Але дадае: «Акрамя дыктатуры палітычнай, ёсць яшчэ і дыктатура часу, яна будзе дыктаваць і расстаўляць усё па сваіх месцах».

Рэдакцыя далучаецца да віншаванняў.

## Барысу Кіту — 100

6 красавіка спаўняецца сто гадоў Барысу Кіту — навукоўцу ў галіне астранаўтыкі і матэматыкі. Дзіцячыя і юнацкія гады ён правёў на Навагрудчыне, у 1944-м з'ехаў на Захад, у ЗША, дзе здабыў сусветную славу. Цяпер спадар Кіт жыве ў Франкфурце-на-Майне. Дай бог кожнаму дажыць да ягоных гадоў.

КАЛЯНДАР

## Красавік

**1** — Дзень дурня.

**4** — Вялікдзень у праваслаўных і каталікоў.

**6** — 100 гадоў спаўняецца выбітнаму беларусу-фізіку, дзеячу беларускай эміграцыі Барысу Кіту (жыве ў Франкфурце-на-Майне).

**13** — Радаўніца.

**20** — 100 гадоў ад трагічнай смерці літаратуразнаўцы Сяргея Палуяна, які адкрыў талент Максіма Багдановіча.

**21** — 100 гадоў таму памёр амерыканскі пісьменнік Марк Твен.

**26** — Дзень Чарнобыльскай трагедыі.

**Уклаў ЛК**

БІБЛІЯТЭКА

## Выйшаў збор твораў Арсеня Ліса

Выйшла новая кніга серыі «Кнігарня «Наша Ніва»: збор твораў Арсеня Ліса «Gloria victis!». Кніга на 750 старонак змяшчае некалькі серый нарысаў партрэтаў нацыянальных дзеячаў і палітыкаў, што стварылі беларускую дзяржаўнасць, распрацоўвалі нацыянальную беларускую канцэпцыю — Аляксандра Уласава, Браніслава Тарашкевіча, Аркадзя Смоліча, Тамаша Грыба... «Гэта кніга аб нашай знішчанай інтэлігенцыі, трагедыі нашай нацыі. Даючы такую назву кнізе, я аддаю належнае тым людзям», — адзначыў Арсень Ліс.

**АП**




СЦІСЛА

### Гарбук атрымаў «Крыштальную Паўлінку»

Вечарам 27 сакавіка ў Тэатры імя Янкі Купалы прайшоў капуснік, прысвечаны Міжнароднаму дню тэатра. Адбылося ўзнагароджанне за найлепшыя тэатральныя работы года. Уладальнікам найвышэйшай узнагароды — «Крыштальнай Паўлінкі» — стаў купалавец, народны артыст Беларусі Генадзь Гарбук.

### Ліхавы развітаўся з Беларуссю прэзентацыяй рамана Бабінай

26 сакавіка ў пасольстве Украіны ў Беларусі ў Мінску прайшла прэзентацыя рамана Наталкі Бабінай «Рыбін горад». Дакладней, украінскага перакладу. Ён мае неўзабаве выйсці ў кіеўскім выдавецтве «Зялёны пёс». Выдаюць кнігу пад назвай: «Пахне людиною» («Пахне чалавекам»). Шмат слоў удзячнасці выслухаў у гэты вечар пасол Украіны ў Беларусі Ігар Ліхавы, які ад'язджае на Радзіму. Прысутныя дзякавалі за падтрымку беларускай культуры, зычылі поспехаў і яму, і Украіне. Наступным паслом стане экс-кіраўнік Сакратарыята прэзідэнта Юшчанкі Раман Бяссмертны.

**Ул.інф.**

# Спрыяльны клімат для дзяржаўнасці

**Пра чаргаванне пацяпленняў і пахаладанняў у апошняе тысячагоддзе піша гісторык Алег Дзярновіч.**

Мы жывём у галацэне. Такую назву атрымала геалагічная эпоха, якая пачалася 10—12 тысяч гадоў таму, пасля апошняга вялікага зледзянення (у нашым рэгіёне яно мае назву *Паазерскага зледзянення*).

Сучасны клімат больш спрыяльны, чым клімат напярэдадні нашай эры, і, безумоўна, больш мяккі за клімат канца XIII — сярэдзіны XIX стст. Але для кліматолагаў і геолагаў бясспрэчна таксама і тое, што на працягу большай часткі галацэну кліматычныя ўмовы былі больш спрыяльныя, чым цяпер. Мы жывём у адносна халодную эпоху гісторыі Зямлі, якая яшчэ не скончылася.

Галацэн вылучаецца адноснай стабільнасцю клімату. Але пра гэтую стабільнасць мы можам казаць, вядома, толькі на фоне тых пастаянных зменаў клімату, якія адбываюцца на працягу ўсёй гісторыі развіцця нашай планеты.

Клімат нават апошняга тысячагоддзя мае некалькі розных перыядаў. На працягу VIII—XIII стст. у нашай мясцовасці было нашмат цяплей, чым цяпер. Гэты перыяд называецца *Малым кліматычным оптымумам*. Мяркую, невыпадкова ўзнікненне дзяржаўнасці на нашых землях супала з тым пацяпленнем. Максімум пацяплення прыйшоўся якраз на першую палову XIII ст. — і гэты быў самы спрыяльны для сельскай гаспадаркі час.

Але ў канцы XIII—XIV стст. наступае чарговае пахаладанне, і гэты этап працягваўся да сярэдзіны XIX ст. Амаль паўсюдна клімат стаў халаднейшым, няўстойлівым, скараціўся вегетатыўны перыяд. 1272—1291 гады былі незвычайна сухімі, а ў пачатку XIV ст. (1312—1322 гг.) — незвычайна вільготнымі. Ураджайнасць у XIV ст. у параўнанні з папярэднім стагоддзем упала да 20 %.

Пачатак *Малога ледавіковага перыяду* храналагічна супаў са станаўленнем на нашых землях Вялікага Княства Літоўскага. І ліцвінскай адміністрацыі прыходзілася мець справу з новымі кліматычнымі рэаліямі.

Чарговае пацяпленне наступіла ў другой палове XIX ст., яно дасягнула свайго максімуму ў 1930—40-я. Выключэнне — фенаменальна халодная зіма 1941-га. Ад 1950-х кліматолагі назіралі чарговае пахаладанне. Шмат у чым падобныя ваганні клімату звязваюць з *цыркуляцыйнымі працэсамі* ў атмасферы. Так, пацяпленне 30—40-х гг. XX ст. было якраз звязана з гэтай цыркуляцыяй, а не «парніковым эфектам», які прамысловасць тых часоў ніяк не магла забяспечыць.

Як бачым, ваганні клімату былі заўжды і былі звязаныя, галоўным чынам, з цыркуляцыйнымі атмасфернымі зменамі. Толькі гэтым можна растлумачыць, што ў 1950-я, пры павелічэнні ўтрымання ў атмасферы $CO_2$, назіралася пахаладанне. Спецыялісты ўказваюць, што пры разліку сённяшняй сітуацыі, якую назвалі *Глабальным пацяпленнем*, цыркуляцыйны фактар якраз і не ўлічваецца. У якой ступені сучасны чалавек уплывае на клімат? Методыкі разліку гэтага ўплыву далёкія ад дасканаласці.

Іншая рэч, што нас у большай ступені павінны хваляваць чысціня паветра ў нашых гарадах і ступень забруджанасці грунтовых водаў.

## Інструментальныя назіранні

На што ж можна абаперціся, калі мы вывучаем гісторыю клімату нашага краю? Інструментальныя назіранні — вымярэнне прыборамі тэмпературы паветра, вільготнасці, атмасфернага ціску і г.д. — праводзяцца ў Еўропе толькі з XVIII ст.

З'яўленне цікавасці да навуковага даследавання надвор'я ў нашым краі звязана з павелічэннем увагі да навук аб прыродзе ў Галоўнай Літоўскай школе, як называўся Віленскі ўніверсітэт у канцы XVIII ст. А сістэматычныя метэаназіранні распачаў рэктар універсітэта і рэфарматар навукі Марцін Пачобут-Адляніцкі, які яшчэ ў 1760-я прывёз з Заходняй Еўропы ў Вільню для гэтага прыборы і абсталяванне.

Штодзённыя назіранні за тэмпературай паветра стала пачалі праводзіцца з мая 1770-га. Запісы першых сямі гадоў назіранняў загінулі падчас Напалеонаўскіх войнаў у 1812 г. Да нашых жа дзён дайшлі запісы, якія захавалі вынікі штодзённых назіранняў ад 17 студзеня 1777 г.



**Віцебскі ваявода Ян Антоні Храпавіцкі пакінуў унікальныя назіранні за надвор'ем за 1669—1685 гады.**

Тэрмометры былі замацаваныя на паўночным муры будынка абсерваторыі на вышыні прыблізна 21 м ад паверхні зямлі і зацяняліся ад промняў сонца сценамі будынкаў.

У Мінску ў 1846 г. на Саборнай плошчы (сёння пл. Свабоды) быў усталяваны прыбор для вымярэння ўзроўню ападкаў. У загадзе гарадскіх уладаў асобна абумоўлівалася, што гэты прыбор павінен быў і плошчу ўпрыгожваць, і адначасова служыць навуцы.

Але самыя раннія сістэматычныя метэаназіранні на сённяшняй тэрыторыі Беларусі пачалі праводзіцца з 1809 г. на метэастанцыі Магілёва, створанай пры мужчынскай гімназіі.

У наступны год метэаназіранні былі арганізаваныя ў Віцебску. Пункт метэаназіранняў, як і Магілёве, быў створаны пры Віцебскай гімназіі, на левым беразе Дзвіны. Прыборы ж размяшчаліся ў садзе гімназіі.

У Гродне метэаралагічныя назіранні распачаліся толькі ў 1839 г.

Метэаралагічная сетка на тэрыторыі Беларусі пачала стварацца ў пачатку XIX ст. — раней, чым у іншых рэгіёнах Расійскай імперыі.

Так ці інакш, фіксаваныя вынікі метэаназіранняў мы маем толькі з канца XVIII ст. Як працаваць з ранейшымі перыядамі?

Вялікае значэнне мае досвед даследавання глабальнага клімату. Ужо назапашаны багаты матэрыял вывучэння льдоў Альпаў, Грэнландыі, Антарктыды, які дазваляе казаць пра змены клімату. Але як гэтую інфармацыю прывязаць у нашым краі да дакладнай храналагічнай шкалы і ацаніць ступень уплыву кліматычных зменаў на жыццё грамадства?

## Хронікі і мемуары

Неацэнную дапамогу могуць аказаць беларускія хронікі і мемуары. Адной з найбольш інфарматыўных тут будзе «Баркулабаўская хроніка», складзеная ў канцы XVI — пачатку XVII стст. у мястэчку Баркулабава (сёння ў Быхаўскім раёне) праваслаўным святаром Хведарам Магілёўцам. У кліматычным сэнсе храніст фіксаваў тыя падзеі, якія найбольш моцна адбіваліся на жыцці яго суайчыннікаў. Вось як, напрыклад, айцец Хведар апісваў халодны 1585 год: «Госпад Бог вялікае мноства страшных і вялікіх цудаў пажадаў паказаць: град і перуны [грымоты — Рэд.] вялікія, засуха, маразы ці не ўвесь год былі ў Літве. Ад вялікіх маразоў жыта ў полі пасохла, а мноства дамоў паноў шляхетных ад вялікіх перуноў пагарэла, зімой жа ад маразоў і завірух загінула на дарогах вялікае мноства жабракоў і купцоў». А ў 1602 годзе «на дзясятым тыдні ў Вялікі чацвер быў страшны мароз. Што было кветак — то ўсё памарозіў. Пачатак быў грозны, а канец — слёзны. Усю агародніну — капусту, буракі, цыбулю, мак, гарох, ячмень, яравую пшаніцу — мароз пабіў. Слёзна было бачыць гэтых галодных людзей, якія толькі агароды пасеялі...»

Але здараліся і цёплыя зімы, як, напрыклад, у 1588 годзе: «...18 студзеня, пасля святога Апанаса на трэці дзень быў вялікі дождж, аж снег сагнала. Было амаль як увесну: пастухі ў бор статкі пагналі пасвіць, а потым праз тры тыдні — зноў лютая зіма». Пасля папярэдніх трох халодных зімаў «у год 1604 на Святога Васіля, інакш кажучы — на Новы год, была зіма вельмі добрая, пагодлівая да вялікага посту. А потым на пятым тыдні вялікага посту снег з дажджом быў вялікі, ажно Дняпро разліўся і снег сагнала...»

Халодныя зімы Малога ледавіковага перыяду адзначыла і «Магілёўская хроніка»: «Год 1709. У гэтым годзе была лютая зіма, стаяла доўга, снягі былі невыносныя і нечувана вялікія, што не толькі звяр'ё, птаства, але і людзі на дарогах мерзлі».

Гэта прыклады адзначэння нейкіх экстрэмаў. Ёсць і зусім іншы тып назіранняў за надвор'ем. Фенаменальнай выглядае тут постаць Віцебскага ваяводы (з 1669 г.) Яна Антонія Храпавіцкага, які метадычна на працягу трыццаці гадоў, ад 1656 і да сваёй смерці ў 1685 г., вёў дзённік. Практычна кожны запіс Храпавіцкі пачынаў з характарыстыкі надвор'я ў гэты дзень.

Ваяводы ў Рэчы Паспалітай былі не толькі адміністратыўнымі кіраўнікамі ў сваіх ваяводствах, але адначасова і сенатарамі. Яну Антонію прыходзілася шмат падарожнічаць па сваёй краіне, ён удзельнічаў у дэмаркацыі межаў ВКЛ з Маскоўскім царствам, уваходзіў у склад перамоўнай камісіі падчас заключэння Андросаўскага перамір'я 1667 г., браў удзел у працы 24 Соймаў... І паўсюль, дзе б ён ні быў, сціслымі фармулёўкамі фіксаваў надвор'е.

Тры тамы дзённікаў за 1656—1673 гады былі выдадзены польскімі гісторыкамі. Але, як прызнаўся адзін з выдаўцоў, гісторык Анджэй Рахуба, далей займацца выданнем гэтага спецыфічнага помніка ў іх няма імпэту — гэтыя аднастайныя запісы нязмат чаго могуць дадаць да вывучэння палітычнай гісторыі. Так і ляжаць гэтыя тамы ў кракаўскім Нацыянальным музеі непрачытанымі.

Між тым, у мінулым ваганні клімату маюць да палітычнай гісторыі наўпростае дачыненне. Часта, напрыклад, вялікі снег, нечуванае разводдзе затрымлівалі войскі і вырашалі лёс істотных паходаў. Нават у XX стагоддзі. Самы свежы прыклад — лютая зіма 1941-га.

Калі ж накласці суб'ектыўныя паведамленні нашых папярэднікаў на тую сетку кліматычных ваганняў, якую распрацоўваюць кліматолагі і геолагі, мы атрымліваем унікальную магчымасць выбудовы дакладнай храналагічнай шкалы зменаў надвор'я. Ад прыватных прыкладаў мы можам перайсці да шырокага і дакладнага малюнка зменаў клімату ў нашым рэгіёне. Гэтыя даследаванні толькі распачынаюцца.




**Зімы ў XVII ст. былі такімі халоднымі, што Тэмза ў Лондане цалкам замярзала.**




# Кава-кава — не выйсце

**Расслабляльныя напоі, супрацьлегласць энергетычных, — новая сумнеўная мода.**

Расслабляльныя напоі, папулярныя цяпер на Захадзе, здымаюць стрэс і трывогу, дапамагаюць заснуць. Але яны не прайшлі строгіх клінічных выпрабаванняў і прынамсі некаторыя іх інгрэдыенты выклікаюць сумневы.

Пад расслабленнем не маецца на ўвазе джын-тонік. Новыя напоі ўтрымліваюць экстракты раслін ці нават натуральныя чалавечыя гармоны. Яны дапамагаюць расслабіцца без шкоды для арганізму, якую прыносіць алкаголь.

Амаль 100 відаў расслабляльных напояў з'явілася на амерыканскім рынку за апошнія тры гады. Многія напоі травяныя і могуць выкарыстоўвацца ў гарманальнай тэрапіі, але таксама могуць мець і пабочныя эфекты, папярэджваюць навукоўцы.

Напрыклад, корань п'янкога перцу, які таксама мае назву кава-кава — інгрэдыент аднаго з відаў содавай, — навукоўцы прызнаюць першакласным сродкам у лекаванні сімптомаў трывожнасці — прыступаў неабгрунтаванай трывогі. Але ўжываць яго рэкамендуецца толькі людзям, якім быў пастаўлены дыягназ «трывожнасць», а не тым, у каго звычайны стрэс.

Кава-каву варта ўжываць з асцярогай, асабліва людзям, у якіх ёсць рызыка зарабіць праблемы з печанню, бо справа можа дайсці да пячоначнай недастатковасці і неабходнасці перасадкі гэтага органа, кажуць навукоўцы.

Таксама трэба шукаць прычыны бяссонніцы і стрэсу ды пазбаўляцца ад іх, а не спяшацца з дапамогай таблетак выправіць наступствы.

Не бывае чароўнай таблеткі ад жыццёвых праблем. Лад жыцця — вось над чым трэба працаваць у першую чаргу.

**КаМ**

НАВУКА

# Каўбасы як какаін

**Амерыканскія навукоўцы даказалі, што абжорства — форма наркаманіі.**

Залішняе спажыванне высокакаларыйнай ежы выклікае ў мозгу змены, характэрныя для наркатычнай залежнасці. Да такіх высноваў прыйшлі супрацоўнікі Даследчага інстытута Скрыпса (ЗША), вывучаючы паводзіны пацукоў.

У ходзе эксперыменту, які доўжыўся больш за тры гады, навукоўцы забяспечылі паддоследным жывёлам неабмежаваны доступ да высокакаларыйнай ежы, прываблівай як для людзей, так і для грызуноў, — шынкі, каўбасы, кандытарскіх вырабаў і г.д. Як і чакалася, прывілеяваныя пацукі елі больш і набіралі вагу хутчэй, чым іх браты з кантрольнай групы, якая сілкавалася звычайным кормам.

Пры гэтым змены, што назіраліся ў паводзінах грызуноў, былі падобныя да рэакцый, характэрных для наркатычнай залежнасці. Страціўшы доступ да ўлюбёных прадуктаў, пацукі адмаўляліся ад звычайнага корму, прычым такая «галадоўка» магла працягвацца да двух тыдняў. Прагу высокакаларыйнай ежы не маглі стрымаць нават балючыя ўдары токам.

Даследуючы мозг паддоследных жывёл, навукоўцы выявілі ў пацукоў, што прыахвоціліся да каларыйнай ежы, прыкметнае скарачэнне колькасці дапамінавых рэцэптараў D2 у структурах сістэмы ўзнагароды мозгу. Падобнае назіраецца пры працяглым ужыванні наркотыкаў, у прыватнасці, какаіну. Навукоўцы атрымалі дадатковае пацверджанне сувязі гэтага працэсу з развіццём залежнасці і кампульсіўных паводзінаў, штучна скараціўшы колькасць рэцэптараў D2 у мозгу пацукоў. Непераадольная цяга да высокакаларыйнай ежы у гэтых жывёл развівалася значна хутчэй, чым у звычайных грызуноў.

Атрыманыя дадзеныя сведчаць, што залішняе спажыванне высокакаларыйнай ежы і непераадольнае імкненне атрымліваць ад ежы задавальненне абумоўленыя тымі ж біяхімічнымі механізмамі, што і наркатычная залежнасць.

**КаМ**

ПСІХАЛОГІЯ

# Чаго найбольш саромеюцца мужчыны, а чаго — жанчыны

Сярод палякаў было праведзенае апытанне наконт таго, што яны звычайна хаваюць ад іншых. За што ім сорамна.

Мужчыны ў першую чаргу змаўчалі б пра хваробу (29%), «некаторыя непрыемныя факты з мінулага» (27%) і адсутнасць грошай. Спіс таго, чаго саромеюцца мужчыны, дапаўняюць «дзіўныя звычкі» (24%), «некаторыя рысы характару» (21%) і «адсутнасць пэўных навыкаў» (11%).

Спіс жаночых сакрэтаў падобны да мужчынскага. За адным выключэннем: большасць полек — 30% — у якасці прычыны сораму назвалі адсутнасць грошай.

**КаМ**

МОДЫ

# Спераду — цішотка, а ззаду...

Майка Maison Martin Margiela спераду выглядае звычайна, але ззаду здзіўляе сюрпрызам.

Малюнкі на майцы з відамі прыроды або горада — адзін з хітоў гэтай вясны. Пальмы дамінуюць у калекцыі Prada, у калекцыі H&M можна пабачыць кашалькі, якія выглядаюць, як паштоўкі, Marin Margiela Maison дае адчуць дыханне лета і пераносіць нас на райскія пляжы.

Майка з калекцыі Maison Martin Margiela спераду мае выяву мора і берагавой паласы. Прыгожыя колеры і плямы ствараюць святочны настрой, да якога ідэальна пасуюць адкрытыя плечы. Ззаду майка зробленая з тонкіх паскаў, якія сплеценыя паміж сабой і ўтвараюць нешта кшталту ажурнага ўпрыгожання.

Майку можна набыць у онлайн-краме Net-A-Porter. Каштуе каля 407 еўра. А ці вартая яна таго, кожная жанчына рашае сама.

# Чаму жанчыны не хочуць крутых мужыкоў

**Жанчыны з краін, дзе насельніцтва здаравейшае, аддае перавагу мужчынам больш фемінізаваным.**

4800 жанчын з розных краінаў узялі ўдзел у эксперыменце лабараторыі Абердынскага ўніверсітэта (Шатландыя). Жанчынам парамі паказвалі мужчынскія твары. Ім неабходна было выбраць больш прывабны. Твары мелі нязначныя адрозненні. Яны былі створаныя праграмай, якая надавала рысам больш «мужчынскасці» ці «жаноцкасці». У некаторых вусны былі танейшыя, чым у «двайнікоў», або шырэй пасаджаныя вочы, або гусцейшыя бровы.



Жанчыны з краін, дзе стан аховы здароўя невысокі і існуе пагроза выжыванню, аддавалі перавагу больш «мужным» мужчынам. З пункту гледжання эвалюцыі маскулінласць — эфект высокага ўзроўню тэстастэрону — гарантыя добрых генаў і верагоднасці стаць бацькам здаровых дзяцей. Аднак высокі ўзровень тэстастэрону таксама з большай імавернасцю робіць мужчын менш прыязнымі, менш пастаяннымі, агрэсіўнейшымі і незацікаўленымі ў выхаванні дзяцей. І вось, аказваецца, жанчыны падсвядома бяруць пад увагу абодва фактары.

**КаМ**

# Такі ён, Апалон-2010

**Камаль Ібрагім выйграў тытул найпрыгажэйшага мужчыны ў свеце. А беларус суддзям не спадабаўся.**




Больш за два тыдні ў Сеуле 74 прывабныя мужчыны з розных краінаў канкуравалі ў спартовых выпрабаваннях, прыгатаванні страваў карэйскай кухні, а таксама ва ўменні прыгожа насіць стылёвыя рэчы. Фінал конкурсу адбыўся 27 сакавіка.

Самым прыгожым мужчынам у свеце быў абраны 24-гадовы тэлевядучы з Ірландыі. Камаль Ібрагім, нягледзячы на нетыповае для ірландца імя, нарадзіўся і вырас у горадзе Лімерык. Магчыма, што яго поспех крыецца менавіта ва ўменні адрозніваццa ад іншых.

Скульптурным целаскладам і цёмнакарымі вачыма ён заваяваў прыз у $50 тыс. і магчымасць заключыць кантракты з вядучымі мадэльнымі агенцтвамі свету.

Другое месца журы прысудзіла Ёзафу Карасу (Чэхія), трэцяе месца — Кенэт Акалі (Нігерыя).

Беларускі прадстаўнік у лідэры не трапіў. Майстар спорту па дзюдо Міхал Баранаў, напэўна, не адпавядаў параметрам самых прыгожых мужчынаў свету. 21-гадовы студэнт быў першым у гісторыі прадстаўніком нашай краіны на модным конкурсе.

**Настасся Шамрэй**

АЎТО

# Renault Logan і Ford Focus — самыя папулярныя ў Маскве

**па выніках 2009 года.**

Уладальнікамі новых «Фокусаў» у мінулым годзе сталі 13 181 жыхар расійскай сталіцы. А колькасць уладальнікаў Renault Logan за мінулы год у сталіцы павялічылася на 8381 чалавека.

У адрозненне ад агульнарасійскага рэйтынгу, дзе першыя месцы пакуль яшчэ займаюць мадэлі Lada, у сталіцы вазаўская прадукцыя папулярнасцю не карыстаецца. У Маскве Priora ўвогуле не трапляе ў дзясятку лідэраў, а Samara і «класіка» займаюць толькі восьмае і дзясятае месцы. Іх успешна абганяюць Chevrolet Lacetti, Opel Astra, Kia Ceed і Nissan Qashqai. На адным узроўні з вазаўскімі мадэлямі таксама прадаецца Mazda-3.

# Кітайцы хочуць зрабіць з Volvo тыгра

Кітай стане другім рынкам Volvo — абвясціла кітайская кампанія Geely пасля падпісання кантракта на набыццё шведскага аўтавытворцы. Кантракт быў падпісаны ў другой палове дня ў нядзелю ў штаб-кватэры Volvo ў Гётэборгу. За Volvo амерыканскія ўласнікі кампаніі атрымаюць 1,8 млрд даляраў.

Volvo — адна з самых вядомых аўтамабільных кампаній у свеце, вядомая якасцю, бяспекай і інавацыйнымі тэхналогіямі.

Летась Geely выпусціла 330 тысяч аўтоў. З набыццём шведскай фірмы кітайцы падвояць выпуск.

ПОБЫТ

# Слінг можа задушыць немаўля

У ЗША і Канадзе адклікаюць больш за мільён сумак-пераносак для немаўлят вытворчасці кампаніі Infantino. Стала вядома, што яны маглі прывесці да гібелі трох дзяцей. Гаворка ідзе пра дзве мадэлі — **SlingRider і Wendy Bellissimo.**

У Камітэце спажыўцоў ЗША заявілі, што немаўляты маглі задыхнуцца ў мяккіх складках торбы-пераноскі. Бацькам рэкамендавана спыніць выкарыстанне гэтых прыстасаванняў для пераноскі дзяцей, якім менш за чатыры месяцы.

Слінгі Infantino сустракаюцца і ў Беларусі, але яны далёка не папулярныя.

**Матэрыялы паласы падрыхтавала КаМ**



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Шасціразовыя чэмпіёны краіны, футбалісты БАТЭ (Барысаў), рыхтуюцца да сезону.**

## ФУТБОЛ

### Першы тур

**3 красавіка (субота)** стартуе 20-ы чэмпіянат Беларусі па футболе. Упершыню ў ім возьмуць удзел толькі 12 каманд. Яны ў тры колы вызначаць медалістаў першынства. Няўдачніка, што вылеціць у першы дывізіён. А таксама каманду, якая ў стыкавых матчах пазмагаецца за права застацца ў лізе вышэйшай. У першым туры гуляюць: **Брэст. ГАСК «Брэсцкі».** «Дынама» (Брэст) — «Шахцёр» (Салігорск). **Жодзіна. Стадыён «Тарпеда».** «Тарпеда» (Жодзіна) — БАТЭ (Барысаў). **Мінск. Стадыён «Дынама».** «Мінск» — «Дняпро» (Магілёў). **Наваполацк. Стадыён «Атлант».** «Нафтан» (Наваполацк) — «Партызан» (Мінск). **Бабруйск. Стадыён «Спартак».** «Белшына» (Бабруйск) — «Дынама» (Мінск). **Гродна. ЦСК «Нёман».** «Нёман» (Гродна) — «Віцебск».

## КАНЦЭРТЫ

### Нейрадзюбель

**1 красавіка а 19-й у «Рэактары» (вул.В.Харужай, 29)** — сольны канцэрт гурта.

### Крама

**10 красавіка а 18-й у «Графіці» (зав.Калініна, 16)** — канцэрт «Крамы».

### Women's Fest-2010

**11 красавіка а 18-й у Тэатры эстрады (вул.Маскоўская, 18а)** — Women's Fest-2010. Бяруць удзел: **Indra**, **Exist-M**, **«Гаротніца»**, **Unia**, **ZM99**, **«Ракаш»**, **Rostra**, **Hasta La Fillsta**.

### J:морс

**21 красавіка а 19-й у к/з «Мінск» (вул.Кастрычніцкая, 5)** — J:морс.

## ІМПРЭЗЫ

### +1 ГеніюшВерш

**Кожную нядзелю а 15-й у кнігарніЎгалерэі (пр. Незалежнасці, 37а)** можна пачуць верш Ларысы Геніюш у выкананні аднаго з вядомых паэтаў.

### Чацвёрты міжнародны фестываль паэзіі «Парадак словаў»

Месцы правядзення — **Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры (вул. Багдановіча, 13)**, **Мастацкая галерэя «Ў» (пр.Незалежнасці, 37а)**, **кавярня «Валерыя» (вул. Валадарскага, 7)**.

Праграма фестывалю:

**9 красавіка (пятніца)**

**Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры (вул. Багдановіча, 13): 15.00 — 17.00** — Імпрэза ў межах 4-га фестывалю паэзіі «Парадак словаў». Выступы беларускіх літаратараў. Бяруць удзел: Адам Глобус, Зміцер Плян, Ілля Сін, Сяргей Календа, Вольга Гапеева, Севярын Квяткоўскі, Анатоль Брусевіч, Віка Трэнас, Аксана Спрынчан, Міхась Башура. Падчас мерапрыемства будзе прэзентавацца кніга Сяргея Календы «Гісторыі (не) пра нас. Казкі».

**Мастацкая галерэя «Ў» (праспект Незалежнасці, 37а): 18.30 — 20.30** — Адкрыццё 4-га Міжнароднага фестывалю паэзіі «Парадак словаў». Выступаюць: Уладзімір Арлоў (Мінск), Дзмітрый Строцаў (Мінск), Зміцер Вішнёў (Мінск), Адам Глобус (Мінск), Алена Ганчарова (Мінск—Масква), Віталь Рыжкоў (Мінск), Алена Ісаева (Масква), Аляксандр Шышкін (Масква), Вольга Сульчынская (Масква), Лёша Яфімаў (Масква), Дзмітры Дзмітрыеў (Магілёў), Лера Сом (Полацк) і інш. Вядоўца — Андрэй Новікаў. **20.30 — 21.00** — У межах адкрыцця фестывалю — прэзентацыя новай кнігі Андрэя Хадановіча «Несіметрычныя сны».

**10 красавіка (субота)**

**Мастацкая галерэя «Ў» (праспект Незалежнасці, 37а): 12.00 — 12.45** — Сучасныя паэтычныя пераклады. Бяруць удзел: Павал Анціпаў, Вера Бурлак, Віктар Жыбуль, Віталь Рыжкоў. Вядоўцы — Андрэй Хадановіч і Марыя Мартысевіч. **12.45 — 13.45** — «Паэзія не для ўсіх». Презентацыя кніжнай серыі «Галерэя Б.» (Мінск). Вядоўца — Ігар Бабкоў. **13.45 — 14.45** — Прэзентацыя кніг выдавецтва «Арт Хаус медыя» (Масква). Бяруць удзел: Алена Ісаева, Міхаіл Кагановіч, Андрэй Каровін, Вольга Сульчынская, Аляксандр Рапапорт. Вядоўца — Аляксандр Шышкін. **14.45 — 15.45** — Прэзентацыя кніг выдавецтва «Галіяфы» (Мінск). Бяруць удзел: Усевалад Гарачка, Вера Бурлак, Віктар Жыбуль, Аляксей Чубат, Арцём Кавалеўскі. Вядоўца — Зміцер Вішнёў. **15.45 — 17.00** — Выступы гасцей фестывалю «Парадак словаў». Бяруць удзел: Дзмітрый Бурага (Кіеў), Лёша Яфімаў (Масква), Сяргей Касяшнікаў (Кіеў), Любава Малышава (Масква) і іншыя. Вядоўца — Андрэй Новікаў.

**Кавярня «Валерыя» (вул.Валадарскага, 7): 17.30 — 21.00** — Першы беларускі «Турнір паэтаў». Вядоўцы — Андрэй Каровін і Аляксей Яфімаў.

**11 красавіка (нядзеля)**

**Мастацкая галерэя «Ў» (праспект Незалежнасці, 37а): 12.00 — 13.30** — Паэтычная праграма «8 жанчынаў». Вядоўца — Марыя Мартысевіч. **13.30 — 14.45** — Прэзэнтацыя фестывалю «Час і месца». Бяруць удзел: Алена Казанцава, Міхаіл Ганчароў, Галіна Дубянецкая, Людка Сільнова. Вядоўца — Дзмітрый Строцаў. **14.45 — 15.00** — Закрыццё Чацвёртага міжнароднага фестывалю паэзіі «Парадак словаў».

Уваход на ўсе мерапрыемствы вольны.

### Вечарына ў гонар Барыса Кіта

**6 красавіка а 17-й у Палацы мастацтва (вул.Казлова, 3)** — святочная вечарына ў гонар 100-годдзя Барыса Кіта. На яе будуць запрошаныя прадстаўнікі айчыннай навукі і культуры, беларускай дыяспары.

### Святая праўда ды іншыя казкі

**31 сакавіка а 19-й у кнігарніЎгалерэі** — вечарына «Святая праўда ды іншыя казкі». Гэта прэзентацыя аднайменнага зборніка маладых літаратараў — лаўрэатаў конкурсу Беларускага ПЭН-цэнтру. У кнізе ёсць і пераклады Уладзь Лянкевіч будзе гаварыць за Апалінэра, Алена Талапіла за Генрыха Бёля, Наталля Давыдоўская за Германа Гесэ, Алена Пятровіч за Яна Бжэхву, паэты Алеся Башарымава, Віталь Быль, Ірына Барысевіч будуць гаварыць самі за сябе. Уваход вольны.

## ВЫСТАВЫ

### Жывапіс у Нармандыі

**У Мастацкім музеі да 25 мая** працуе выстава «Жывапіс у Нармандыі». Гэты ўнікальны збор твораў мастацтва вандруе па свеце як калекцыя, якая паказвае зараджэнне імпрэсіянізму ў Францыі.

### Накіды і малюнкі расійскіх мастакоў

**Да 24 красавіка ў Мастацкім музеі** працуе выстава «Накіды і малюнкі рускіх мастакоў XIX—XX стст. са збораў музея». На выставе прадстаўленыя накіды І.Шышкіна, Я.Волкава, Б.Кустодзіева, Ф.Малявіна, К.Рудакова, В.Сярова. Большая частка графічных лістоў экспануецца ўпершыню.

### Bielaruski — women of Europe

**У гатэлі Crowne Plaza Minsk, кавярні «Star»,** адкрыты fashion project Алены Адамчык «Bielaruski — women of Europe». Выстава працуе **да 4 красавіка**.

### Ціхае жыццё

**У галерэях «Ракурс», «Лабірынт» і «Атрыум» Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі да 15 красавіка** працуе выстава «Ціхае жыццё», прымеркаваная да 200-годдзя з дня народзінаў І.Хруцкага. На выставе прадстаўлены жывапіс, графіка, фота, кераміка, бацік. Удзел у ёй бяруць каля 60 мастакоў з Беларусі, Расіі, Украіны, Сербіі, Арменіі, Вялікабрытаніі, Ірландыі, Латвіі, Польшчы, Францыі.

### Беларусь запаведная

**У Гістарычным музеі да 4 красавіка** працуе фотавыстава Вячаслава Алешкі «Беларусь запаведная».

## ТЭАТРЫ

**1 красавіка**

**Тэатр лялек** — «Балада пра белую вішню»
**Тэатр юнага гледача** — «Вандраванне ў Княства Сноў»
**Купалаўскі тэатр** — «Паўлінка»
**Тэатр оперы і балета** — «Легенда пра Уленшпігеля»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Містэр Розыгрыш»
**Тэатр імя Горкага** — «Свабодны шлюб»

**2 красавіка**

**Музычны тэатр** — «Бураціна. by»
**Тэатр юнага гледача** — «Бармалей»
**Тэатр лялек** — «Пінокіа»
**Музычны тэатр** — «Іспанскія мініяцюры»
**Купалаўскі тэатр** — «Памінальная малітва»
**Тэатр імя Горкага** — «Свабодны шлюб»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Раман + Юлія»

**3 красавіка**

**Тэатр лялек** — «Прыгоды Пін-Піна»
**Купалаўскі тэатр** — «Афрыка»
**Музычны тэатр** — «Даратэя»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Адэль»
**Тэатр оперы і балета** — «Бахчысарайскі фантан»
**Купалаўскі тэатр** — «Чорная панна Нясвіжа»
**Тэатр імя Горкага** — «На залатым возеры»

**4 красавіка**

**Тэатр лялек** — «Кот у ботах»
**Тэатр імя Горкага** — «Злоўлены сеткай»

**5 красавіка**

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Каласы пад сярпом тваім»
**Купалаўскі тэатр** — «Чорная панна Нясвіжа»
**Купалаўскі тэатр** (Малая сцэна) — «Варшаўская мелодыя»

**6 красавіка**

**Тэатр юнага гледача** — «Ліса і вінаград»
**Тэатр імя Горкага** — «Утаймаванне наравістай»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Белы анёл з чорнымі крыламі»
**Купалаўскі тэатр** — «Каханне ў стылі барока»

**7 красавіка**

**Купалаўскі тэатр** — «ГендэльБах»
**Тэатр імя Горкага** — «Пакінутая жанчына (Мачаха)»
**Купалаўскі тэатр** — «Вячэра з прыдуркам»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Нязваны госць»
**Тэатр оперы і балета** — «Карміна Бурана. Кармэн-сюіта»

**8 красавіка**

**Тэатр лялек** — «Чаму старэюць людзі?..»
**Купалаўскі тэатр** (Малая сцэна) — «Зіма»
**Тэатр оперы і балета** — «Вяселле Фігара»
**Купалаўскі тэатр** — «Вяселле»
**Тэатр імя Горкага** — «Праўда — добра, а шчасце — лепш»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Адвечная песня»

**9 красавіка**

**Купалаўскі тэатр** (Малая сцэна) — «Зіма»
**Купалаўскі тэатр** — «Вяселле»
**Тэатр юнага гледача** — «Маскарад»
**Тэатр імя Горкага** — «Бег»
**Тэатр лялек** — «Гісторыя аднаго горада»
**Тэатр оперы і балета** — «Спячая красуня»

**10 красавіка**

**Тэатр лялек** — «Васіліса Прыўкрасная»
**Тэатр юнага гледача** — «Па зялёных гурбах акіяна»
**Купалаўскі тэатр** — «Translations»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Неба ў дыяментах»
**Тэатр оперы і балета** — «Мадам Батэрфляй»
**Тэатр імя Горкага** — «Ад'ютант-Ша Яго Вялікасці»
**Купалаўскі тэатр** (Малая сцэна) — «Старамодная камедыя»

**11 красавіка**

**Тэатр лялек** — «Чырвоны каптурок»
**Тэатр юнага гледача** — «Прыгоды Бібігона»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Каласы пад сярпом тваім»
**Купалаўскі тэатр** — «Translations»
**Купалаўскі тэатр** (Малая сцэна) — «Беларусь у фантастычных апавяданнях»
**Тэатр імя Горкага** — «Пане Каханку»
**Тэатр оперы і балета** — «Шчаўкунок»

**12 красавіка**

**Купалаўскі тэатр** — «Сымон-музыка»

**14 красавіка**

**Тэатр юнага гледача** — «Бліндаж»
**Тэатр оперы і балета** — «Рамэа і Джульета»
**Купалаўскі тэатр** — «Вечар»
**Купалаўскі тэатр** — «Паўлінка»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Раман + Юлія»

**15 красавіка**

**Тэатр лялек** — «Вясёлы цырк»
**Тэатр юнага гледача** — «Бліндаж»
**Тэатр імя Горкага** — «Легенда пра беднага д'ябла»
**Тэатр оперы і балета** — «Кармэн»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Чайка»
**Купалаўскі тэатр** — «Дзеці Ванюшына»

**16 красавіка**

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Яго апошняе каханне (Лета)»
**Тэатр лялек** — «Дом, які пабудаваў Свіфт»
**Тэатр юнага гледача** — «Тарас на Парнасе»
**Тэатр оперы і балета** — «Папялушка»
**Тэатр імя Горкага** — «Пане Каханку»
**Купалаўскі тэатр** (Малая сцэна) — «Старамодная камедыя»
**Купалаўскі тэатр** — «Ядвіга»

**17 красавіка**

**Тэатр лялек** — «Марозка»
**Тэатр юнага гледача** — «Дзюймовачка»
**Тэатр імя Горкага** — «Царэўна-жабка»
**Купалаўскі тэатр** — «Пінская шляхта»
**Тэатр оперы і балета** — «Папялушка»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Белы анёл з чорнымі крыламі»
**Тэатр імя Горкага** — «Распуснік»

**18 красавіка**

**Тэатр лялек** — «Чароўная лампа Аладзіна»
**Тэатр юнага гледача** — «Дзюймовачка»
**Купалаўскі тэатр** — «Пінская шляхта»
**Тэатр імя Горкага** — «Даходнае месца»
**Купалаўскі тэатр** (Малая сцэна) — «Востраў Сахалін»
**Тэатр оперы і балета** — «Рыгалета»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Каласы пад сярпом тваім»

## КІНО

### Поп

Расія, 2010, каляровы, 130 хв.

**Рэжысёр:** Уладзімір Хаціненка

**Ролі выконваюць:** Сяргей Макавецкі, Ніна Усатава, Кірыл Плятнёў, Генадзь Гарбук, Ліза Арзамасава, Ганна Гураленка, Руслан Ягудзін

**Жанр:** Драма паводле рамана Аляксандра Сегеня

**Адзнака:** 5,5 (з 10)




Жнівень 1941 года. З Рыгі на Пскоўшчыну, дзе не засталося храмаў, адпраўляюцца святары-місіянеры. Адзін з іх — айцец Аляксандр. Аднаўляць царкоўнае жыццё пад акупацыяй. Фашысты страляюць, лютуе паліцыя, а ў лясах дзейнічаюць партызаны.

Пскоўская праваслаўная місія — адна з малавядомых старонак гісторыі. Прататыпам айца Аляксандра паслужыў архімандрыт Іаан; фільм здымаўся па дабраславенні патрыярха Алексія II.

Герой Сяргея Макавецкага разумее, што ў любым выпадку місія будзе альбо выразаная, альбо сасланая. Але ён з пакорай робіць сваю справу.

У Расіі фільм абвінавацілі ва «ўласаўстве» і «прыніжэнні вялікай Перамогі».

Між тым, загана ў іншым: фільм выйшаў даволі ялейны і бесканфліктны.

Але на Вялікдзень — добра глядзіцца. Светлыя кадры, мудрыя вочы.

**Андрэй Расінскі**

# Сэкс а 6-й, а 16-й — уколы

Навукоўцы распрацавалі ідэальны распарадак дня.

Усяму свой час. Многія з нас калісьці чулі, што не варта купляць абутак раніцай і класціся спаць ў розны час. Даследчыкі сабралі такога кшталту меркаванні і стварылі ідэальны графік дня.

### 6.00 — найлепшы час для сэксу

Асабліва калі пара хоча дзіця. З пункту гледжання гармонаў гэта найлепшы час для сэксу. Узровень эстрагену і тэстастэрону ў гэты час самы высокі, тлумачаць псіхолагі.

### 7.00 — сняданак

Пасля васьмі гадзін сну запасы глюкозы заканчваюцца. Праз гэта наш мозг не функцыянуе належным чынам, тлумачыць доктар Эндру Мюрэй з факультэта фізіялогіі і развіцця ў Трыніці-каледжы (Кембрыдж). Не варта пачынаць працу без снядання. Што паесці? Урсула Арэнс, дыетолаг з Брытанскага фонду харчавання, рэкамендуе шматкі з цэльнага зерня — пасля такога снядання вы доўгі час не адчуваеце голаду.

### 7.15. — прымі лекі

Калі вы прымаеце вітаміны ў таблетках, то яны падзейнічаюць лепш, калі прымаць іх у першай палове дня. Аднак большасць лекаў не варта прымаць на пусты страўнік.

### 7.30. — пачысці зубы

Найлепей пачакаць з чысткай зубоў паўгадзіны пасля ежы. Зубная эмаль успрымальная да пашкоджанняў пасля ежы і піцця, бо кіслоты, якія ўтрымліваюцца ў харчовых прадуктах, размякчаюць яе.

### 10.00 — час для складаных праблем

Пасля сняданку глюкоза дасягае мозгу. У гэты час лягчэй за ўсё канцэнтравацца, актывізуецца кароткачасовая памяць — так лічаць даследчыкі з Цэнтра па вывучэнні расстройстваў сну і бяссонніцы ў Нью-Ёрку.

### 13.00 — абед

У гэты час стрававальная сістэма працуе лепш за ўсё. Дыетолаг Урсула Арэнс раіць з'есці бутэрброд з хлебам з непрасеянай мукі і тунцом, салату, потым якой-небудзь садавіны.

### 15.00 — прагуляйся

Пасля абеду людзі адчуваюць сябе соннымі. Большая частка крыві ідзе да страўніка, таму мозг горш забяспечваецца крывёй. Доктар Пітэр Вэн, дырэктар Цэнтра па парушэннях сну ў Лондане, рэкамендуе не паддавацца жаданню падрамаць — гэта можа прывесці да трывожнага сну ноччу і нават да бяссонніцы. Лепш 20 хвілінаў пагуляць на сонцы, каб скура атрымлівала вітамін D.

### 16.00 — зрабі ўкол

У гэты час мы маем самы высокі ўзровень эндарфінаў, таму будзе лягчэй справіцца з непрыемнымі адчуваннямі.

### 17.30 — час для трэніроўкі

У гэты час тэмпература цела высокая, таму цягліцы найбольш моцныя і пругкія, кажа доктар Джэф Дэйвіс, спартыўны фізіёлаг.

### 18.30 — купі абутак

Ногі ацякаюць цягам дня. Таму абутак, набыты раніцай, можа зрабіцца замалым увечары. Калі вы плануеце купляць абутак, найлепшы час — бліжэй да вечара.

### 19.00 — келіх віна

Пячонка ў гэты час працуе найлепш. Алкаголь хутка метабалізуецца. Але памятайце: калі выпіць больш за адзін келіх, гэта можа паўплываць на біялагічны рытм і выклікаць бяссонніцу.

### 19.30 — вячэра

Рэгулярнае харчаванне вельмі важнае. Паводле дадзеных даследчыкаў, нерэгулярнае харчаванне прыводзіць да павелічэння вагі. Калі вашае цела занадта доўга чакае новай порцыі ежы, запавольваецца абмен рэчываў. Эксперты раяць не класціся спаць раней, чым праз дзве гадзіны пасля ежы. У адваротным выпадку занадта высокі ўзровень глюкозы ў крыві не дае спаць.



### 21.30 — падрыхтоўка да сну

Даросламу чалавеку трэба спаць у сярэднім 7—8 гадзін. Найлепш класціся і ўставаць заўсёды ў адзін час. Каб прывыкнуць да пастаяннага рэжыму, трэба каля трох тыдняў. Але гэта варта таго, сцвярджае доктар Пітэр Вэн, дырэктар Цэнтра па парушэннях сну ў Лондане.

**КаМ**

ЗДАРОЎЕ

# Курэнне «праз трэція рукі» такое ж небяспечнае

Канцэрагены ад тытуню застаюцца на сцэнах і мэблі.

Сцены аўтамабіляў і памяшканняў, у якіх кураць, утрымліваюць канцэрагенныя рэчывы, што ўжо не маюць паху тытуню і цалкам незаўважныя, але небяспечныя. Таму забарона на курэнне ў грамадскіх месцах, уведзеная ў Еўропе, глыбока абгрунтаваная.

Навукоўцы высветлілі, што першапачаткова бясшкодныя рэчывы, якія знаходзяцца ў паветры памяшканняў, дзе сістэматычна паляць, могуць ператварацца ў канцэрагены з цягам часу. Рэчывы, якія ёсць у цыгарэтным дыме, у прыватнасці нікацін, асядаюць на паверхнях. Сам нікацін не канцэраген, аднак ён хімічна актыўны і ўзаемадзейнічае з іншымі рэчывамі. У пэўным спалучэнні нікацін пераходзіць у родназныя яму нітразаміны, а ўжо яны — высокаканцэрагенныя. Іх удыхаюць усе людзі ў памяшканні, нават калі цыгарэтнага дыму ў паветры ўжо і няма. Для такога ўздзеяння ўведзены тэрмін «курэнне праз трэція рукі».

Роднасныя тытуню нітразаміны (tobacco-specific nitrosamines, TSNA) першапачаткова былі знойдзеныя на паверхнях у аўтамабілях заўзятых курцоў. Потым было праведзенае лабараторнае мадэляванне ўзаемадзеяння рэчываў дыму з паверхнямі і атмасферным паветрам. У якасці мадэлі матэрыялу паверхні была выбраная цэлюлоза. На паверхню з сарбіраваным тытунёвым дымам на працягу трох гадзін уздзейнічалі азоцістай кіслатой у канцэнтрацыі 60 мільярдных доляў (што мадэлюе ўтрыманне ў атмасферы). За час эксперыменту канцэнтрацыя TSNA на паверхні вырасла ў 10 разоў.



Нітразаміны могуць пранікаць у арганізм альбо непасрэдна праз скуру, альбо падчас удыху, альбо ўсмоктвацца праз слізістыя рота і носа.

Нікацін можа захоўвацца на паверхнях унутры памяшканняў на працягу дзён, тыдняў і нават месяцаў. Дзеці, якія шмат часу праводзяць седзячы на падлозе, падвяргаюцца ўздзеянню шкодных рэчываў, што ўтвараюцца падчас канверсіі нікаціну. Яны трапляюць у арганізм дзяцей праз скуру або падчас удыху. Калі курцы клапоцяцца пра здароўе сваіх дзяцей і блізкіх, яны павінныя ўстрымацца ад курэння ў доме і ў машыне. «Пракураныя» дываны і мэблю наогул трэба прыбраць з дому, таму што яны змяшчаюць вельмі вялікую колькасць «другасных» канцэрагенаў».

Зрэшты, дым і яго рэшткі захоўваюцца ў вопратцы курца, нават калі ён курыць на вуліцы. Таму найлепшы спосаб засцерагчы сябе і сваіх блізкіх — гэта не курыць наогул.

**КаМ**

ТЭХНАЛОГІІ

## Двухколавае аўто будучыні

Канцэпт-кар атрымаў назву EN-V.

Карпарацыя GM з партнёрамі з кітайскай Shanghai Automotive Industry Corporation падрыхтавала для выставы World Expo-2010 прататып гарадскога аўтамабіля.

Гэта двухмесцавая і двухколавая машынка. Месца для яе прэзентацыі падабралі вельмі ўдалае — горад Шанхай, адзін з самых густанаселеных мегаполісаў у свеце. Там жыве каля 20 мільёнаў чалавек, таму праблема дарожных затораў стаіць вельмі востра. Зрэшты, машынка прызначаная не толькі для Кітая, бо спецыялісты мяркуюць, што да 2030 г. у мегаполісах будзе жыць 60% насельніцтва Зямлі.

EN-V абсталяваны модулем GPS і сістэмай сувязі з іншымі машынамі, а таму можа ў аўтаматычным рэжыме выбіраць маршрут. Убудаваныя камеры і сэнсары дапамагаюць камп'ютару рэагаваць на зменныя вонкавыя ўмовы, пазбягаць сутыкненняў.

Два электрычныя рухавікі ўбудаваныя проста ў колы, энергію для іх выпрацоўваюць літый-іонныя батарэі, ёмістасці якіх хапае на 40 кіламетраў дарогі. Зараджаць батарэі можна будзе ад звычайнай хатняй разеткі. Важыць EN-V 500 кг.

**КаМ паводле газеты.ру**



## Сапраўдная беларуская кухня

### Суп каралеўскі

1,25—1,5 кг ялавічыны, 1 або 0,5 курыцы, 200 г шынкі, 0,5 французскай булкі, 100 г масла, 2 лыжкі мукі, 25 г салодкага міндалю, 10 жаўткоў, 0,5 шклянкі віна, 1—2 цыбулі, 2—3 морквы, 1—2 пятрушкі, 0,5 сельдэрэю, 0,5—1 парэй, соль.

Карэнне нарэзаць тоўста, масла растапіць, дадаць муку, прасмажыць, дадаць да карэння. Курыцу разрэзаць на некалькі частак, дадаць міндальныя арэхі, растоўчаныя ў ступцы з невялікай колькасцю вады. Зварыць з гэтага булён. Шынку дробна нарэзаць, змяшаць з цёртай булкай і жаўткамі, заліць булёнам, пракіпяціць пад крышкай, прапусціць праз сіта і падаваць на стол. Да гэтага супу падаюцца грэнкі ці клёцкі; можна таксама дадаць у суп віно.

**З кнігі «Вялікалітоўская (беларуская) кухарка», выдала М. Станкевічыха ў Нью-Ёрку (1959), падрыхтавала НБ**

## Прыватныя абвесткі

**КУРСЫ МОВЫ І ГІСТОРЫІ**

**ГА «Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны» арганізуе бясплатныя заняткі** па беларускай мове і гісторыі для школьнікаў 7-х — 9-х класаў. Заняткі праводзяць вядомыя педагогі, кандыдаты навук, выдатнікі адукацыі Беларусі. Заняткі праходзяць кожны аўторак ад 16.00 да 18.00 у памяшканні ТБМ (Мінск, вул. Румянцава, 13, каля ст.метро «Плошча Перамогі»). Даведкі праз т..: (017) 284-85-11, (029) 639-27-15.

**АКОННЫЯ РАМЫ**

**Драўляныя зашклёныя** аконныя рамы б/в, танна. Т.: (029) 570-80-88.

**СПАЧУВАННІ**

**Выказваем свае шчырыя спачуванні Святлане Шыла** ў сувязі са смерцю бацькі, Касцяна Івана Аркадзевіча. Нашы спачуванні ўсім родным і блізкім памерлага. Сябры з Салігорску

**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e-mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайта www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

## Газетка дзеткам



ЕХАЎ КАЗАЧНІК БАЙ

— Ехаў казачнік Бай
Цераз сёлы і гай.
Баіць ці не?
— Бай!

— Ён пытаўся ў мяне:
— Што даць дзецям у сне? —
Баіць ці не?
— Бай!

— Я прасіў: дзецям дай
Казку-песеньку, Бай!
Баіць ці не?
— Бай!

— А найлепшую з іх
Дам для самых малых.
Баіць ці не?
— Бай!

Тым хто любіць мяне
І хто першы засне. —
Баіць ці не?
— Не!

**Максім Танк**



CATHOLIC.BY

Містэрыя. На мінскай Кальварыі каталікі аднавілі падзеі ўкрыжавання Ісуса ў выглядзе спектакля.



Аляксандр Лукашэнка дае інтэрв'ю падчас венесуэльскага візіту. Пра тое, што кіраўнік дзяржавы працуе, а не адпачывае на пляжы, сведчылі плаўкі колераў дзяржаўнага сцяга.



Хмары чаек над Баранавічамі. Гэтыя птушкі даўно не залежаць ад водных рэсурсаў і жывяцца на сметніках.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Задворкі Мінскага трактарнага завода на вуліцы Ваўпшасава забітыя трактарамі.



PHOTO.BYMEDIA.NET

У Мінску зацвілі крокусы.

Шаноўныя чытачы! Наступны нумар «НН» выйдзе **14 красавіка**, пасля Вялікадня і Радаўніцы.




PHOTO.BYMEDIA.NET

Рэклама ў Шаркаўшчыне.



Victoria's Secret прэзентавала сёлетнюю калекцыю купальнікаў. Яе прадставілі тры мадэлькі: Міранда Кер, Кэндыс Свэйнпул і Алесандра Амбросіа.

## АНЕКДОТЫ

***

— Мама! Тата ляжыць непрытомны, у руцэ ў яго нейкая паперка, а побач скрутак...

— Ну, нарэшце прывезлі футра, якое я замаўляла!

***

У савецкі час толькі ўлада псавала людзей, а цяпер да ўлады прыходзяць ужо гатовыя кадры.

***

Арганізатары выставы карцінаў Пабла Пікасо звяртаюць увагу наведнікаў на тое, што атрымаць асалоду ад працаў мастака можна і ў цвярозым стане.

***

Сядзіць праграміст за камп'ютарам. Раптам чуе стук у дзверы. Адчыняе, а там стаіць старая баба, уся ў чорным, і з пасатыжамі.

— Ты хто?

— Я Смерць!

— А чаму без касы, а з пасатыжамі?

— А я па камп'ютар прыйшла!

***

— Гарбата ёсць? — пытаецца інтэлігент у краме.

— Ёсць. Грузінская ці кітайская?

— Ах, вы так ставіце пытанне?! Тады лепей давайце каву!

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**Івянец, Мінскага павета.** У нашым мястэчку ўсё добра, толькі не добра, што іншыя дзяўчаты надта разбадзяліся, забыўшыся нават, што такое стыд. Так, нядаўна тры дзяўчыны пайшлі ў карчму п'янстваваць.

**Сфінкс, Івянец**

**Вішнева Ашмянскага павета.** Хлопец з вёскі Вуглы, спаткаўшы ў Вішневе знаёмую С., загаварыў з ёй па-польску. Але тая адказвала яму па-беларуску. Той, узлаваўшыся. Спытаў: «А як замуж пойдзеш, па якому будзеш вучыць сваіх дзяцей?» — «А ўжо ж па-беларуску», — адказала дзяўчына. А многа, вельмі многа могуць зрабіць нашы кабеты ў справе адраджэння нашага народу!

**Я.С., Вішнева**

**«НН». №13. 1910**

**Быкаў дае падказку палітыкам**

У выступе Васіля Быкава прагучала важная падказка нацыянальнаму адраджэнню, прапанова змяніць ракурс з патэтычнага на прагматычны. Маўляў, мы не настолькі дужыя, каб быць настолькі бясхітраснымі.

«Адразу пасля абвяшчэння БНР была дапушчаная вялікая памылка. Як вядома, бальшавікі папракалі Урад БНР за тэлеграму кайзеру Вільгельму. Маўляў, гэтая тэлеграма зганьбіла беларускую ідэю — ідэю незалежнасці. А насамрэч што ж адбылося? Літоўцы і латышы паслалі такія тэлеграмы раней, і яны атрымалі афіцыйнае еўрапейскае прызнанне сваёй незалежнасці. Беларусы паслалі са спазненнем больш чым на месяц і, такім чынам, не атрымалі ні адказу, ні прызнання, а толькі зганьбілі пэўным чынам свой гонар. Як важна кожную справу рабіць своечасова!» — сказаў Быкаў.

**«НН». №13. 2000**

**Наша Ніва**
незалежная газета
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Генадзевіч Скурко
заснавальнік — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА.** Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №248 ад 22 чэрвеня 2009 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, вул. Асаналіева, 15-128. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

**Наклад 6320.** **Газета выдаецца 48 разоў на год.**
Нумар падпісаны ў друк 23.00 30.03.2010.
Замова № 1545.
Рэдакцыйны адрас: Асаналіева 15-128.
Цана дамоўная.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
ISSN 1819-1614
9771819161008 10013